**Скарочаны пераклад «Віленскага альбома»**

**Станіслава Лорэнца**

Ад перакладчыка: Станіслаў Лорэнц (Stanisław Lorentz) нарадзіўся 28 красавіка 1899 г. у Радаме (Польшча), памёр 15 сакавіка 1991 г. у Варшаве. Польскі мастацтвазнавец, прафесар Варшаўскага ўніверсітэта (1947 г.), ганаровы член многіх еўрапейскіх акадэмій, эксперт ЮНЕСКА.

Станіслаў Лорэнц нарадзіўся ў сям'і выкладчыкаў са шведскімі каранямі. Бацька быў германістам, маці - географам. У сям'і панаваў культ навукі, што і вызначыла лёс будучага навукоўца.




Пасля заканчэння аспірантуры восенню 1924 г. Лорэнц застаўся працаваць у Варшаўскім універсітэце. У 1927 г. стаў чыноўнікам Міністэрства веравызнанняў і народнай асветы. У 1929-1935 гг. узначальваў аддзелы аховы помнікаў у Віленскім і Наваградскім ваяводствах, адначасова выкладаў у Віленскім універсітэце імя Стэфана Баторыя, з'яўляўся загадчыкам аддзела мастацтваў у віленскім ваяводскім кіраванні.

У работах 1930-х гг. даследаваў асобныя пытанні развіцця беларускай архітэктуры. Аўтар манаграфіі пра І. К. Глаўбіца *“Ян Кшыштаф Глаўбіц, віленскі архітэктар XVIII ст.”* (1937). З 1935 г. віца-дырэктар, з 1936 дырэктар Народнага музея, у 1945-1951 гг. узначальваў Дырэкцыю нацыянальных музеяў і аховы помнікаў у Варшаве.

У 1947 г. атрымаў званне прафесара Варшаўскага ўніверсітэта, з 1949 г. член Польскай акадэміі ведаў, з 1952 г. член-карэспандэнт, а з 1964 г. сапраўдны член Польскай акадэміі навук. З'яўляўся экспертам ЮНЕСКА па пытаннях аховы помнікаў. У 1965-1969 гг. уваходзіў у сойм ПНР ад дэмакратычнай партыі. Меў шэраг дзяржаўных узнагарод.

Перакладчык мае надзею, што яго праца будзе карыснай для ўсіх аматараў гісторыі Заходняй Беларусі 1920-30 гг. Ён ўпэўнены, што чытаць Лорэнца будуць толькі тыя, хто ўжо дастаткова пагружаны ў тэму і таму ён не тлумачыў усе падзеі і не даваў біяграфічных даведак пра аб ўсіх шматлікіх асобах, якія згадваюцца ў кнізе.

Сваю кнігу "Віленскі альбом" Станіслаў Лорэнц не падзяліў на асобныя часткі і каб пры газетным, па-частках, выданні перакладу кнігі, неяк яе лагічна структураваць, перакладчык ад сябе даў назвы часткам тэксту, якія ён пераклаў і выдаў па-беларуску, за што ён выбачаецца перад чытачом.

**У перакладзе маюцца наступныя часткі**:

- Наваградчына
- Вільня, творчая інтэлігенцыя, краёўцы
- Знаходка каралеўскіх магіл, пошукі магілы Вітаўта, помнік Міцкевічу

Пераклад і каментаванне **Леаніда Лаўрэша**



№ 23 (75) 7 ЧЭРВЕНЯ 2023 г.
наша СЛОВА.pdf

*Станіслаў Лорэнц*

# Віленскі альбом. Наваградчына

***Ад перакладчыка:*** *Станіслаў Лорэнц ( Stanislaw Lorentz) нарадзіўся 28 красавіка 1899 г. у Радаме (Польшча), памёр 15 сакавіка 1991 г. у Варшаве. Польскі мастацтвазнавец, прафесар Варшаўскага ўніверсітэта (1947 г.), ганаровы член многіх еўрапейскіх акадэмій, эксперт ЮНЕСКА.*

*Станіслаў Лорэнц нарадзіўся ў сям'і выкладчыкаў са шведскімі каранямі. Бацька быў германістам, маці - географам. У сям'і панаваў культ навукі, што і вызначыла лёс будучага навукоўца.*

*Пасля заканчэння аспірантуры восенню 1924 г. Лорэнц застаўся працаваць у Варшаўскім універсітэце. У 1927 г. стаў чыноўнікам Міністэрства веравызнанняў і народнай асветы. У 1929-1935 гг. узначальваў аддзелы аховы помнікаў у Віленскім і Наваградскім ваяводствах, адначасова выкладаў у Віленскім універсітэце імя Стэфана Баторыя, з'яўляўся загадчыкам аддзела мастацтваў у віленскім ваяводскім кіраванні.*

*У работах 1930-х гг. даследаваў асобныя пытанні развіцця беларускай архітэктуры. Аўтар манаграфіі пра І. К. Глаўбіца "Ян Кшыштаф Глаўбіц, віленскі архітэктар XVIII ст." (1937). З 1935 г. віца-дырэктар, з 1936 дырэктар Народнага музея, у 1945-1951 гг. узначальваў Дырэкцыю нацыянальных музеяў і аховы помнікаў у Варшаве.*

*У 1947 г. атрымаў званне прафесара Варшаўскага ўніверсітэта, з 1949 г. член Польскай акадэміі ведаў, з 1952 г. член-карэспандэнт, а з 1964 г. сапраўдны член Польскай акадэміі навук. З'яўляўся экспертам ЮНЕСКА па пытаннях аховы помнікаў. У 1965-1969 гг. уваходзіў у сойм ПНР ад дэмакратычнай партыі. Меў шэраг дзяржаўных узнагарод.*

У Наваградак я паехаў толькі ў ліпені 1929 года. У газеце "Наваградскае Жыццё" ("Zycie Nowogrodzkie") за 18 ліпеня было апублікавана наступнае паведамленне: *"17 ліпеня ваявода прыняў кансерватара Віленскага і Наваградскага ваяводстваў доктара Лорэнца, з якім правеў канферэнцыю аб захаванні помнікаў у Наваградкім ваяводстве і патрэбы ў грашах для гэтай мэты".*

Ваявода - Зыгмунт Бэчкавіч[1], народжаны ў 1887 г. у маёнтку Лукавіцы Любартоўскага павета, скончыў юрыдычны факультэт Маскоўскага ўніверсітэта, з якога быў выключаны за ўдзел у палітычным гуртку, а потым "з ласкі" зноў прыняты. Да 1-й сусветнай вайны - суддзя ў Седльцах, пасля аднаўлення незалежнасці намеснік урадавага камісара горада Варшавы, затым намеснік варшаўскага ваяводы, з сярэдзіны 1926 г. - ваявода наваградскі. У той час у Польшчы былі тры ваяводы, і ўсе ва ўсходніх тэрыторыях, якія знаходзіліся ў апазіцыі да нацыяналістычнай палітыкі ў дачыненні да нацыянальных меншасцей і выступалі за сапраўднае паразуменне з імі: Бэчкавіч у Наваградку, Ян Крагельскі на Палессі і Генрык Юзэўскі на Валыні.

Бэчкавіч жадаў падтрымліваць зносіны з беларусамі. Яны гэта ацанілі і, калі ён сыходзіў з пасады наваградскага ваяводы, па жаданні беларусаў вуліцу, на якой стаяў будынак ваяводскай управы, назвалі - вуліца Зыгмунта Бэчкавіча. Жонка Бэчкавіча займалася беларускай народнай творчасцю, а потым у Вільні наладзіла сувязь з Таварыствам народнай творчасці. Абодва Бэчкавічы цікавіліся культурным жыццём, сябравалі з мастачкай Міхалінай Кшыжаноўскай[2], удавой Конрада, апекаваліся яго мастацкай спадчынай.

Бэчкавіч меркаваў, што беларусаў трэба не дэнацыяналізаваць, а як грамадзян, уцягнуць у дзяржаўнае жыццё. Ён лічыў неабходным арганізаваць беларускую адукацыю, забяспечыць права карыстання беларускай мовай у справаводстве ў раёнах канцэнтрацыі беларускага насельніцтва, а таксама ўзгадніць з прадстаўнікамі беларусаў спосаб правядзення рэформы сельскай гаспадаркі ў гэтых раёнах. Я вельмі зблізіўся з мужам і жонкай Бэчкавічамі, аднойчы нават гасцяваў у

[1] Зыгмунт Казімір Бэчкавіч (польск. Beczkowicz; 1887-1985), польскі палітык і дзяржаўны дзеяч, у 1926-1931 гг. наваградскі, у 1931-1933 гг. віленскі ваявода. Выступаў за правядзенне больш гнуткай дзяржаўнай палітыкі ў дачыненні да беларусаў. Мемуарыст Андрэй Раствароўскі пісаў: "Ваяводамі ў Наваградку ў той час былі Уладзіслаў Рачкевіч, генерал Янушайціс і Зыгмунт Бэчкавіч, які атрымаў папулярную мянушку "Кадушкін". Ваявода Бэчкавіч не выносіў піцця гарэлкі, таму нават на банкетах дазваляў толькі мінеральную ваду. Ведаючы гэта, на такога кшталту мерапрыемствах наш дальні канец стала заўсёды рыхтаваў адмысловыя бутэлькі ад мінеральнай вады ці ліманаду, у якія налівалі гарэлку. Неяк, падчас банкету, ужо не памятаю з якой нагоды, можа з-за Сельскагаспадарчай выставы, калі мы добра "запраўляліся" з нашых пляшак (стаяла добрая гарачыня), ваявода, які сядзеў пасярэдзіне стала, устаў і пайшоў на наш канец стала, дзе забраў "падрыхтаваную" бутэльку. Сакратар ваяводы, які сядзеў на нашым краі стала не разгубіўся і выхапіў у ваяводы з рук бутэльку са словамі: "Пан Ваявода, дазволіць?", потым зграбна схаваў нашу і адкаркаваў сапраўдную бутэльку з мінеральнай вадой" - Гл: *Rostworowski Andrzej. Moje zycie na Nowogrodczyznie lata 1924-1928 // Goniec Kresowy 2003. № 41. S.15.*

[2] Міхаліна Кшыжаноўская нарадзілася (03.09.1883 - 16.07.1962) - польская мастачка. Яе муж Конрад Кшыжаноўскі (15.02.1872 - 25.05.1922) - польскі жывапісец, прадстаўнік ранняга экспрэсіянізму, партрэтыст, рысавальшчык, ілюстратар і педагог.

pawet.net

іх і памятаю, як Бэчкавіч, падышоўшы да мяне ў халаце, разбудзілі мяне а сёмай раніцы, каб працягнуць нейкую перапыненую напярэдадні ўвечары размову. А рэзідэнцыя ў іх была невялікая - аднапавярховы драўляны дом у скверыку на вуліцы 3-га Мая, мабыць, на пяцьшэсць пакояў, дзе раней жыў Рачкевіч, калі быў навааградскім ваяводам. У 1931 г., пасля ад'езду Рачкевіча ў Варшаву, дзе ён стаў маршалкам Сенату, Бэчкавіч заняў яго пасаду ў Вільні, але прабыў тут толькі два гады, бо маршалак Пілсудскі накіраваў яго амбасадарам Польшчы ў Рыгу. Апошнія чатыры перадваенныя гады ён быў сенатарам. Маё сяброўства з Бэчкавічам яшчэ з навагрдскіх часоў захавалася і да сёння. Дзесятак-другі гадоў таму, абодва ўжо ва ўзросце, мы вырашылі называць адзін аднаго па імёнах. Ён жыў у Гдыні са сваёй вельмі добрай жонкай Марыяй, мастачкай. Мы часта перапісваемся адзін з адным.

Францішак Гадлеўскі, навагрaдскі віца-ваявода, быў вельмі сімпатычным, культурным, высокім і прыгожым чалавекам, а яго жонка, з якой я пазнаёміўся некалькі гадоў таму ў Варшаве ў Таварыстве сяброў Варшавы, была надзвычай актыўнай у культурным і грамадскім жыцці. Потым мы ўспаміналі часы Навагрaдка і іх сына - гэта быў славуты "Антак Распыляч" з Арміі Краёвай, які загінуў падчас Варшаўскага паўстання. Прыгожы хлопчык, вельмі падобны на бацьку. Я сядзеў побач са спадарыняй Гадлеўскай на паседжанні аднаго з аддзяленняў Таварыства сяброў Варшавы, прысвечаным памяці яе сына.

Хацелася б таксама адзначыць вельмі актыўную ў грамадска-культурным жыцці Навагрaдка Тэклю Грынеўскую, жонку навагрaдскага старасты, якая цікавілася помнікамі гісторыі і пісала ў "Навагрaдскае Жыццё".

Асноўнай крыніцай звестак пра Навагрaдчыну стала для мяне калектыўная праца, выдадзеная ў 1925 г. дзякуючы намаганням Польскага агляднага таварыства, - "Навагрудак". Натхненнем для гэтай працы стала паездка ў 1924 годзе кансерватара Ежы Рэмера, доктара Вацлава Баравога, прафесара Уладзіміра Антаневіча, верагодна таксама, прафесара Клоса і настаўніцы, пісьменніцы, экскурсавода Марты Губіцкай (раней яна працавала ў Кельцах і Свянцянах, дзе пазнаёмілася з Рэмерам і Баравым). У гэтай публікацыі былі два вельмі важныя для мяне артыкулы: "Манументальная архітэктура ў Навагрaдскім ваяводстве" Ежы Рэмера і "Навагрaдак Міцкевіча" Вацлава Баравога, апрача артыкулаў пра Нясвіж, Навагрaдак і Слонім і артыкула Марты Губіцкай "Кім бы ты ні быў у Навагрaдку", які цудоўна прадстаўляў атмасфера Навагрaдскай зямлі.

(…) У сваю праграму кансервацыі помнікаў гісторыі ў першую чаргу я ўключыў руіны навагрaдскага замка. З тых невялікіх сродкаў, якія атрымаў ад міністэрства, я не мог дазволіць сабе большага і лічыў, што найперш дзяржава павінна паклапаціцца пра тыя помнікі, якія не служаць сучасным мэтам і не маюць гаспадароў. На ўсю краіну Міністэрства рэлігійных веравызнанняў і народнай асветы мела толькі сто тысяч злотых на кансервацыю помнікаў. Таму роля рэстаўратара заключалася ў тым, каб карыстальнікі клапаціліся пра помнікі, а таксама ў кантролі метадаў і праграм іх захавання.

Работы над замкам у Навагрaдку пачаліся пры маім папярэдніку Ежы Рэмеры ў 1924 годзе. Менавіта тады быў створаны праект увекавечання памяці Адама Міцкевіча шляхам стварэння кургана на гэтак званым малым замку, гэта значыць на ўзгорку, які прымыкае да замка. Камень падмурка гэтага кургана быў асвечаны біскупам Лазінскім у прысутнасці прэзідэнта Станіслава Вайцяхоўскага і тагачаснага навагрaдскага ваяводы Уладзіслава Рачкевіча. А курган склалі з насыпаў, якія атрымаліся з руін і, часткова, з друзу, прывезенага з горада. Таму, адначасова з працай на кургане, у замку пачаліся навукова-даследчыя і кансервацыйныя работы. Аднак выдзеленых Акруговай дырэкцыяй грамадскіх работ сродкаў не хапіла, і ў наступныя гады работы былі спынены.

Таму я дамовіўся з архітэктарам Рамуальдам Гюртлерам, які раней праводзіў работы на замку ў Навагрaдку, і ў 1929 годзе мы аднавілі гэтыя работы і працягнулі іх у 1930-1931 гадах. Па праекту для замкавай гары неабходна было зрабіць:

1. Вывезці завалы і раскрыць абарончыя сцены, як гэта ўжо зроблена паміж цяперашнім уваходам і ўязной вежай, а таксама - злева ад цэнтральнай вежы.

2. Пасля зняцця насыпу, стварэнне праходу на вяршыню і разметка адпаведнай сцежкі, якая вяла бы ў замак праз уязную вежу пасля замуроўкі пралому ў абарончай сцяне, зробленага расейцамі.

3. Упарадкаванне ўнутранага дворыка, г. зн. адпаведнае афармленне газонаў і лавак.

4. Поўная кансервацыя існых муроў.

5. Стварэнне "гістарычнага парку" праз злучэнне курганнага ўзгорка з замкавай гарой.

На жаль, недахоп сродкаў у наступныя гады прывёў да таго, што праца была зноў спынена.

Вялікай падзеяй у канцы лета 1929 г. стаў абвешчаны прыезд у Навагрaдскае ваяводства прэзідэнта Польшчы Ігнацыя Масціцкага. 1 верасня ў ваяводскай управе адбылося арганізацыйнае паседжанне ваяводскай камісіі па прыёме прэзідэнта, у якім прынялі ўдзел каля ста чалавек. Старшынём Грамадзянскага камітэта быў запрошаны ваявода Бэчкавіч, старшынём Выканкама стаў віцаваявода Гадлеўскі, яго намеснікамі - уладальнік маёнтка Горны Чэрніхаў і старшыня Дажынкавай камісіі, дэпутат Канстанты Рдултоўскі і навагрaдскі бурмістр Вольнік. Я стаў старшынём Камітэта па ўзнагародах, у гэты камітэт увайшлі пані ваяводзіна Бэчкавіч і старасціна Грынеўская. Прыезд прэзідэнта, раней абвешчаны ваяводам на 19 верасня, пачаўся ў Слонімскім павеце, дзе прэзідэнта сустракалі вучні школы імя Зоф'і Грыбоўскай і насельніцтва навакольных вёсак. Затым прэзідэнт наведаў школу ў Жыровічах, папяровую фабрыку ў Альбярціне, ваеннаспартыўны стадыён, беларускія вёскі з іх грамадскімі арганізацыямі, прыняў удзел у адкрыцці пачатковай школы і

краязнаўчага музея ў Слоніме. У Баранавіцкім павеце прэзідэнт наведаў фермерскія гаспадаркі ў пасёлку Новае Поле і Грудапольскую прамыслова-лясную гаспадарку Антонія Юндзіла. У Баранавічах ён удзельнічаў у святкаванні дня 9-га Дывізіёна коннай артылерыі[3] і наведаў іншыя вайсковыя часткі, якія там дыслакаваліся. Па дарозе ў Наваградак праз Сталовічы, Гарадзішча і Калдычава ён праехаў радзімай Міцкевіча - праз Туганавічы і Плужыны над Свіцязю, дзе яго прыняло Краязнаўчае таварыства, мясцовае насельніцтва і школьнікі. Затым праз Чомбраў ён урачыста ўехаў у Наваградак. У нядзелю цывільныя і ваенныя ўлады і прадстаўнікі грамадства аддалі даніну павагі, а на двары замкавай гары адбыліся Дажынскі, куды сабраліся земляробы з усяго ваяводства. Нарэшце пан прэзідэнт быў уганараваны банкетам які арганізаваў Ваяводскі камітэт.

Вось тэкст друкаванага меню, на якім пад Каронай знаходзіліся дзве тарчы: Анёл Русі і Пагоня - на сіне-чырвонай стужцы:

*Навагрadскі*
*Ваяводскі грамадзянскі камітэт*
*Прыём Прэзідэнта Рэспублікі Польшча*
*22 верасня 1929 г.*

*МЕНЮ*

*Партугальскі суп у філіжанках*
*Паштэцікі*
*Рыба ў маянэзе*
*Белае віно*
*Індыкі, качкі і рабчыкі*
*салаты і кампоты*
*Чырвонае віно*
*Спаржа, каляровая капуста і гарох*
*Краёвае белае віно*
*Марозіва "Імперыял" з печывам*
*Чорная кава*
*Лікёры*
*Садавіна.*

У панядзелак была сельскагаспадарчая выстава ў Міры, паседжанне павятовай сельскагаспадарчай камісіі ў Нясвіжы, потым сняданак для ўсіх слаёў грамадства, а затым экскурсія па замку. Пасля - сямігадовая школа ў Снове, Клецку і начлег у батальёне КАП. У аўторак - Стоўбцы, затым Івянец і Налібокі, дзе прэзідэнт наведаў прадстаўнікоў паўднёвай часткі Валожынскага павета. Затым агледзеў узорную гаспадарку, сустрэўся з насельніцтвам і вайсковымі асаднікамі ў Шчорсах. У чацвер быў Лідскі павет, шклозавод у Нёмне, сямігадовая школа і сход кааператараў у Лідзе, пасяджэнне ваяводскай земляробчай управы ў Беняконях[4]. Увечары прэзідэнт быў госцем абшарнікаў - у Жалудку яго прымаў прэзідэнт Таварыства землеўладальнікаў Чацвярцінскі[5]. 26 верасня прэзідэнт Масціцкі ўдзельнічаў у 13-м нацыянальным з'ездзе лекараў і прыродазнаўцаў у Вільні. З гэтай прычыны мэр горада Вільні запрасіў *"на раўт а 21.00 у ратушу на вул. Вострабрамская, 5, які ўшануе сваёй прысутнасцю Прэзідэнт Рэспублікі Польшча"*.

(...) Пра сустрэчу прэзідэнта "Наваградскае Жыццё" ад 4 верасня паведаміла наступную інфармацыю:

*"Учора адбылася канферэнцыя па справах сустрэчы прэзідэнта. На канферэнцыі прысутнічалі спадарыня ваяводзіна Бэчкавіч, бурмістр Вольнік і інжынер Тамкевіч. Абмяркоўвалася пытанне ўнутранага аздаблення ваяводскай управы і гарадскога тэатра. У*

[3] 9-ы дывізіён коннай артылерыі - падраздзяленне коннай артылерыі Войска Польскага ў ІІ Рэчы Паспалітай. На мяжы ліпеня і жніўня 1920 г. быў сфарміраваны 8-ы дывізіён коннай артылерыі. Дывізіён удзельнічаў у польска-бальшавіцкай вайне. У чэрвені 1921 г. перайменаваны ў 9-ы дывізіён коннай артылерыі. У мірны час эскадрон дыслакаваўся ў Баранавіцкім гарнізоне.

[4] Пра наведванне пр. Масціцкім Лідчыны, гл: Лаўрэш Л. Л. Шэпт пажоўклых старонак. Лідчына ў люстэрку прэсы. 1900-1939 гг. Гродна, 2017. С. 137-138.

[5] Пра наведванне пр. Масціцкім жалудоцкага палаца: "Вяртаюся ў жалудоцкі палац. Іншая памятная падзея, якую я помню і якая мела месца ў мурах жалудоцкага палаца, быў раўт у гонар прэзідэнта Рэчы Паспалітай Ігнацыя Масціцкага, які адбыўся, здаецца, у верасні 1929 г. Прэзідэнт наведваў Наваградскае ваяводства і прыехаў з Ліды ў Жалудок каля 17-й гадзіны. Як потым стала вядома, ў яго памяці застаўся прыгожы тракт XVIII ст., якім ён ехаў, каб у прафесійнай школе ўзнагародзіць маю цётку Марыю Ляскавіч. У лесе каля Вялікага Мажэйкава загадаў пакінуць шашу і ехаць трактам, якім міма Ішчалны паехаў ажно ў Шчучын.

Узгоднены з уладамі ліст запрошаных гасцей уключаў у сябе паслоў і сенатараў, а таксама кіраўнікоў дзяржаўнай адміністрацыі і самакіравання. Балю не было, а была толькі ўрачыстая вячэра, падчас якой у гонар дастойнага госця выступіў гаспадар дома князь Людвік Чацвярцінскі. Прысутнічала каля 60 чалавек. Пасля вячэры адбыўся раўт з удзелам гасцей як з кола землеўладальнікаў, гэтак і з чыноўнікаў. Спадары ў фраках з ордэнамі, спадарыні ў вячэрніх туалетах.

Халодны, афіцыйны настрой перапыніў мой кузэн Юльян Ляскавіч, энтузіяст, які, як і ўсе мы, з дзяцінства марыў пра незалежную Польшчу. Юльян, высокі, прадстаўнічы бландзін з тыповай славянскай знешнасцю хутка наблізіўся да прэзідэнта і ўкленчыў:

- Шаноўны наш спадар прэзідэнт! - сказаў ён глыбока ўзрушаным голасам - Першы раз у жыцці маю шчасце бачыць у нашых крэсавых землях кіраўніка Польскай дзяржавы, першага саноўніка Рэчы Паспалітай. Прашу дазволіць мне, як сыну, прывітаць цябе!

Прэзідэнт выцягнуў далонь, якую шчаслівы Юльян пацалаваў, пасля чаго абняў Юльяна за галаву, прыціснуў да сябе і выказаў яму сардэчную ўдзячнасць. Гэта сцэна была, як быццам з ранейшых вякоў, гэтак мы калісьці віталі сваіх каралёў". - *Цыт па: Ляскавіч Караль. Красовы двор і яго суседзі. (Пераклад і каментаванне Леаніда Лаўрэша) // Лідскі Летапісец. 2022. № 1-2(97-99). С. 50.*

*матывах упрыгожвання было вырашана захаваць высакародную прастату - і тым больш падкрэсліць прыгожыя архітэктурныя лініі будынка Ваяводскай управы. Агульнае кіраўніцтва працамі дэкаратыўнай часткі, згодна з пастановай Камітэта, узяў на сябе кансерватар доктар Лорэнц. Таксама былі вызначаны планы па ўпрыгожванні горада".*

Я атрымаў пасведчанне з подпісам віцэ-ваяводы Гадлеўскага: *"Пан Станіслаў Лорэнц, доктар філасофіі, ўпаўнаважаны знаходзіцца ў непасрэднай блізкасці ад прэзідэнта Рэспублікі Польшча"*. У запрашэнні на Дажынкі за подпісам Канстанціна Рдултоўскага паведамлялася, што *"ў нядзелю 22 верасня 1929 г. у 12 гадзін на Замкавай гары ў Наваградку, дзякуючы намаганням арганізацый і сельскагаспадарчых школ Наваградскага ваяводства, адбудзецца Свята ўраджаю ў гонар Прэзідэнта Рэспублікі Польшча"*.

У наступным годзе я хацеў пашырыць аб'ём работ па кансервацыі руін сярэднявечных замкаў. Таму я запрасіў кіраўніка дэпартамента выяўленчага мастацтва і старажытнасцей Міністэрства рэлігійных веравызнанняў і народнай асветы архітэктара Яраслава Вайцяхоўскага і Ежы Рэмера, каб разам са мной даследаваць найбольш важныя гістарычныя руіны і вызначыць, чым яны могуць мне дапамагчы. Мы былі ў Троках, Вільні, Медніках і Крэве, а потым 9 траўня 1930 г., прыбылі ў Навагрудак. Камісія з удзелам архітэктара Гюртлера вызначыла, што ў 1930 годзе кансервацыйныя і даследчыя работы на замкавым узгорку павінны быць прадоўжаны, а фрагменты сцен, якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення, павінны быць захаваны. Але на большыя грошы, на жаль, надзеі не было. У сувязі з нашым знаходжаннем у Навагрудку ваявода Бэчкавіч арганізаваў паседжанне Выканаўчага аддзела Камітэта памяці Адама Міцкевіча на Навагрудчыне, які сабраўся пасля доўгай бяздзейнасці. Было вырашана звязацца з гаспадаром дома Міцкевічаў панам Дамброўскім і спадарыняй Вяржбоўскай, каб абмеркаваць магчымасць набыцця гэтага дома для музея Міцкевіча. Як паведамляе "Навагрудскае Жыццё": *"У 11-ты дзень гэтага месяца, кансерватар Лорэнц выязджаў у Шчорсы, Любчу і Нянькаў, каб агледзець стан захавання помнікаў, якія знаходзяцца ў гэтых месцах, і выдаць неабходныя распараджэнні."*

У ліпені 1930 г. я зноў апынуўся ў Навагрудку, а адтуль паехаў у Грушаўку, дзе мясцовы камітэт шукаў парэшткі Тадэвуша Рэйтана. Высветлілася, аднак, як заявіў прафесар Міхал Райхер, парэшткі, знойдзеныя ў мерканай магіле Рэйтана, - не ягоныя парэшткі.

(…) Летам 1930 г. з пані Тэкляй Грынеўскай на аўтамабілі старасты я здзейсніў двухдзённую вандроўку па Навагрудскім павеце: Воўкавічы - з прыгожай драўлянай царквой XVIII ст., Сэрвеч, Туганавічы і па суседстве ў вёсцы Новы Свет - сустрэча з паннай Туганоўскай, старой дамай. Год таму я бачыў, як яна сядзела на канапе з прэзідэнтам Масціцкім. Прыгожая сядзіба і дубы ў Варончы. Райца - на верхняй частцы фасада касцёла, пабудаванага ў 1817 г., надпіс: *"Пабудаваны Канстанцінам, палкоўнікам кавалерыі Ордэна Ганаровага Легіёна ..."* - *"...Statua Haec. Matris Dei e summa fronte Varsoviensis Templi in quo cineres condebantur Magni Ducis Moschorum Basilij Szujski et Demetri fratris eius quos poloni exercitus Imperator Stanislaus Zolkiewskius Moscua post K?uszynense proelium obsesse Captivos suscepit. Huc disiecto Templo translata. R.S. Anno MDCCCXVIII"*[6]. Для мяне гэта быў шок. Знайсці тут, у глухой наваградскай вёсачцы, статую Маці Божай з верхняй часткі фасада касцёла дамініканаў у Варшаве, зруйнаванага ў 1817 г., пра які я пісаў у адным з раздзелаў сваёй доктарскай дысертацыі пра архітэктара Эфраіма Шрэгера! А далей была Вялікая Сваротва, Сянежыцы, Стараельня.

Увосень 1930 года ваявода Бэчкавіч вырашыў скончыць будаўніцтва кургана Міцкевіча ў наступным годзе і арганізаваць тады свята "Дні Міцкевіча" ў Навагрудку. Мерапрыемствы павінны працягвацца ўвесь чэрвень. Яны будуць урачыста завершаны адкрыццём кургана, будуць арганізаваны вандроўкі па Навагрудчыне для груп з усёй краіны, асабліва з ваколіц Міцкевіча - Свіцязь, Туганавічы, Варонча..., будуць праводзіцца лекцыі, тэатральныя імпрэзы, інсцэніроўкі. Тады ж быў створаны камітэт па святкаванні "Дзён Міцкевіча". Маёй задачай было афармленне выставы Міцкевіча.

Я са свайго боку прыкладаў намаганні па выкупе дзяржавай возера Свіцязь. Гэта справа безвынікова была пачата ў 1923 годзе. Цяпер, у 1930 годзе, уладальнікі Свіцязі, сям'я Пушкарскіх, пагадзіліся прадаць дзяржаве возера і прылеглы да яго хутар Пяшчанка - усяго 360 га, у тым ліку плошча возера - 172 га. Але справа пачала зацягвацца. У "Віленскім кур'еры" за 24 траўня 1931 г. паведамлялася, што: *"Сабрана спецыяльная камісія ў асобах пана інжынера ляснічага Пузыноўскага, кансерватара Лорэнца, пана земскага камісара Бірулі-Бялыніцкага і іншых, якія ацанілі Свіцязь разам з Пяшчанкай у суму 300 000 злотых - на што гаспадар пагадзіўся. Пасля падачы ўсіх дакументаў уладальнікам Свіцязі, справа раптам па незразумелых прычынах затрымалася і засталася ў такім стане дагэтуль. Нядаўна, у сакавіку гэтага года, пан Пушкарскі атрымаў ліст ад пана кансерватара Лорэнца, які прызнаваў Свіцязь... помнікам паводле артыкул 3 ардынацыі Прэзідэнта РП ад 6 сакавіка 1928 г. ... Тым часам справа ўскладняецца, цягнецца, і дай Бог, каб нарэшце была вырашана яшчэ праз сем гадоў"*. Вырашыць справу мне не ўдалося - напэўна таму, што цяжка было атрымаць рашэнне ўрада, каб выплаціць 300 000 злотых.

*Stanislaw Lorentz. Album wilenskie. Warszawa, 1986. (фрагмент)*

***Пераклад і каментаванне Леаніда Лаўрэша.***

[6] "Гэта статуя Маці Божай з самога франтона варшаўскага храма дамініканцаў, дзе пахаваны прах вялікага князя маскоўскага Васіля Шуйскага і яго брата Дзмітрыя, якіх польскае войска ... Станіслава Жалкеўскага ўзяло пры асадзе Масквы пасля бітвы пры Клушыне. Перанесены з гэтага разбуранага храма ў 1818 годзе" - *лац.*

***Станіслаў Лорэнц***

# Наваградчына, *працяг*

*(Працяг, пачатак у Наша слова.pdf № 23 (75), 7 чэрвеня 2023.)*

На працягу некалькіх гадоў розныя наведвальнікі Наваградка: моладзь, вайскоўцы, розныя арганізацыі, эпізадычна і павольна насыпалі курган у памяць Міцкевіча. Каб значна паскорыць і завяршыць насыпанне кургана, мабілізавалі войска. Паважным у гэтай справе быў і наш унёсак - грунт і друз з тэрыторыі замка. 1 чэрвеня (1931 г.) ля падножжа кургана адбылася цырымонія пачатку дзён Міцкевіча. Выступаў Бэчковіч, тады ўжо віленскі ваявода. Шэфства над Камітэтам па ўвекавечанні памяці Адама Міцкевіча ўзялі прэзідэнт Ігнацы Масціцкі і маршал Юзаф Пілсудскі. Першую тачку зямлі на вяршыню кургана прывезлі ваявода Бэчковіч[1] і старшыня земскага суда Генрык Мурашка. З гэтага моманту моладзь і людзі старэйшага ўзросту, якія індывідуальна ці турыстычнымі групамі прыязджалі ў Наваградак, прынялі ўдзел у будаўніцтве кургана, пры гэтым кожны атрымліваў пячатку і ўпісваўся ў ганаровую кнігу. 7 чэрвеня ў Наваградку адбылося свята песні, у якім удзельнічалі спеўныя гурткі школьнай і сельскай моладзі ваяводства, а 21 чэрвеня - з'езд членаў найбольш шматлікіх арганізацый па падтрымцы арміі, прыбылі таксама дэлегацыі ўсіх армейскіх частак, якія кватаравалі ў ваяводстве і суседніх паветах.

28 чэрвеня ў Наваградку завяршыліся ўрачыстасці месяца Міцкевіча. У гэты дзень сабраліся прадстаўнікі ўраду, прафесара паланістыкі ўніверсітэтаў, пісьменнікі (Серашэўскі, Налкоўская, Парандоўскі, Кляшчынскі, Гёталь ды іншыя), віленскія літаратары: Лапалеўская, Дабачэўская, Ромер-Ачанкоўская, магчыма, Гулевіч, Люк Хаміньскі, Вітольд Станевіч, Мірак Сляндзіньскі, Хапэн, Квяткоўскія, Балзукевіч, Вяслаўскія, Маралоўскі і яшчэ Рэмер з Варшавы - усіх не памятаю, але гасцей у той дзень было больш за сто. Бэчковіч запрасіў біскупа Уладзіслава Бандурскага, былога капелана легіёнаў, і менавіта ён, а не дыяцэзіяльныя ўлады, прадстаўляў духавенства. Вацлаў Серашэўскі[2] прывёз апошнюю ганаровую тачку на вяршыню і з вяршыні кургана выступіў з прамовай. Курган меў 17 метраў у вышыню і 30 метраў у шырыню.

Мы арганізавалі выставу ў будынку Ваяводскай ўправы на вызваленым для гэтага першым паверсе (былы будынак кляштара дамініканцаў). На выставе было прадстаўлена 512 экспанатаў. У яе аснову пакладзены шматлікія прадметы, запазычаныя Янам Міхальскім з Варшавы, Аляксандрам Сямковічам са Львова і Юзафам Рыхлевічам з Вільні. Тут меліся 26 рукапісаў, 49 замежных выданняў твораў Міцкевіча, 5 сцэнічных апрацовак, 65 перакладаў на розныя мовы, 45 нотных зборнікаў да паэзіі Міцкевіча, 9 твораў філаматаў, 184 даследаванні жыцця і творчасці Адама Міцкевіча, 18 розных кніг, 70 партрэтаў Міцкевіча, 16 розных партрэтаў, 10 гістарычных карцін і відаў, 9 сувеніраў.

Праграма закрыцця месячніка Міцкевіча ў Наваградку ў нядзелю 28 чэрвеня ўключала ў сябе:

11-00 - урачыстае набажэнства ў старадаўнім фарным касцёле. Была выстаўлена метрычная кніга парафіяльнага касцёла за 1782-1805 гг. з запісам пра Адама Міцкевіча, гэта кніга была, бадай, самай вялікай каштоўнасцю.

12-00 - завяршэнне насыпання кургана-помніка і перадача яго пад апеку горада.

13:00 - выстава пра Міцкевіча.

14.00 - 17.00 - прыём ежы, урачыстая акадэмія ў зале гарадскога тэатра.

20.00 - вечар у замку: рэгіянальныя спевы.

На панядзелак, 29 чэрвеня, у праграме меліся: "Калектыўныя вандроўкі па памятных мясцінах пад кіраўніцтвам прафесійных экскурсаводаў". У сваім камюніке Камітэт па сяткаванні паведаміў, што праезд на аўтобусе да Свіцязі каштуе 3 злотыя, начлег у інтэрнаце над гэтым возерам для членаў групавых паездак па 50 грошаў з асобы, для неарганізаваных турыстаў у агульным пакоі -

---

[1] "... былі і ліберальныя палякі. У Наваградак, напрыклад, прыйшоў ваявода Бэчковіч, які пасля быў ваяводам віленскім. Дык ён адзін з першых польскіх ліўералаў зацікавіўся беларускай справай і нават хацеў дапамагчы беларусам, каб вырваць іх з-пад камуністычнага ўплыву. Нават прыходзіў да нас у (беларускую) гімназію інспектаваць нашу дзейнасць. Пазней ён дапамог атрымаць ёй дзяржаўныя правы. Бо раней беларускія гімназіі не мелі ніякіх правоў, былі прыватныя, а паступіць у польскія беларусам не давалі. Беларусы змушаны былі ехаць у Чэхію. ... у 28-м годзе з дапамогай ваяводы Бэчковіча мы здолелі атрымаць дзяржаўныя правы, і не трэба было ехаць у Чэхію, ехалі ў Вільню ці Варшаву і там канчалі ўніверсітэты. Дапамагала ў гэтым таксама Тэкля Грынеўская, жонка наваградскага старасты, полька беларускага паходжання, якая пазітыўна ўплывала на Бэчковіча. ... Перад самай вайной польскія ўлады так прыціснулі нас за беларускую справу, што немагчыма было дыхаць. Мы, настаўнікі, скончыўшы адзін год, не ведалі, ці пачнём другі, Так цяжка стала, што мы рашылі пажаліцца. І зрабілі беларускую дэлегацыю ў Варшаву - да паслоў у Сойме і ўлады. ... А на той час Зыгмунд Бэчковіч, які добра да мяне ставіўся, стаў ужо сенатарам. Мы пайшлі да яго, каб ён нам дапамог пабачыць высокіх міністраў. А той кажа: "Мяне так адсунулі, што цяпер я для вас нічога ўжо зрабіць не магу"". - цыт па: Аповяды Барыса Кіта, запісаныя Васілём Быкавым улетку 2001 года ў Франкфурце-на-Майне // Народная Воля. 2012. 48-49. - *Л. Л.*

[2] Вацлаў Каятан Серашэўскі (1858 - 1945), грамадскі і палітычны дзеяч, кавалер ордэна Virtuti Militari, пісьменнік, сібірскі ссыльны, падарожнік, даследчык, этнограф Сібіры і, дэпутат Сойма і сенатар. - *Л. Л.*

першая ноч 1,20 зл., наступная ноч 0,80 зл., асобны пакой 2 зл.

Ваявода Бэчковіч загадаў мне запрасіць пасля наведвання замка на вечар 28 чэрвеня, 20 асоб на вячэру - канешне, за кошт Камітэта. Я замовіў лепшы ў Наваградку рэстаран Лайпунэра (яўрэйскі), узровень якога значна перавышаў маштабы горада з шасцю тысячамі жыхароў (столькі ў Наваградку было людзей). Гэты рэстаран хутчэй падыходзіў для абшарнікаў і заможных людзей. Кухня ў ім была выдатная і разнастайная, меліся лепшыя айчынныя і замежныя напоі. Рэстаран месціўся на першым паверсе і меў вялікую залу. Я замовіў аркестр, і мы з жонкай Ірэнай сталі гаспадарамі вечарыны. Не памятаю, хто прысутнічаў на гэтай вячэры, але госці былі і з Варшавы і з Вільні. Атмасфера вечара адрознівалася прыемнасцю і нязмушанасцю, настрой хутка падняўся і танцавалі амаль што ўсе. Мне, як вядоўцу, трэба было сачыць, хто з дам карыстаецца меншай увагай, і запрашаць іх на танец. Налкоўская танцавала вельмі ахвотна, але яна была завялікая і зацяжкая для танцаў. Так здаралася, што мне давялося танцаваць з ёй амаль што ўвесь вечар. Танцуючы, я стаміўся яе паварочваць, і таму ў мяне ўзнікла ідэя самому абярнуцца вакол яе. Такі метад даў вельмі добрыя вынікі.





*Наваградскі, а потым віленскі ваявода Зыгмунт Бэчковіч, 1931 г. (злева). Зыгмунт Бэчковіч і Станіслаў Лорэнц, 1978 г. (справа).*

Ужо развіднела калі мы выйшлі з рэстарана. Каб асвяжыцца, група віленцаў вырашыла зайсці яшчэ і ў замак. Скажу праўду, што мы, мужчыны, былі ў вельмі-вельмі вясёлым настроі. Для мяне ў такія моманты Ірэна заўсёды была каменем, яна не любіла піць алкаголь, дазваляла сабе максімум адзін-два кілішкі. На замкавай гары мы пачалі думаць, ці цяжка будзе падняцца на руіны замкавай вежы (каля 20 м). Баляслаў Балзукевіч, якога мы звалі "Балзук", намеснік прафесара скульптуры ў Вільні, старэйшы за мяне гадоў на 20, як і ўсе даволі п'яны, сказаў: "А я б залез…". "Вы спалохаліся б …". "Не, не спалохаўся б …", і ён насамрэч вельмі п'яны, пачаў караскацца ўверх пакуль не дасягнуў вяршыні. Аднак, калі ён зірнуў адтуль уніз, адразу працверазеў і, прыціснуўшыся да сцяны, пачаў гаварыць, што не можа спусціцца, бо гэта занадта высока. Мы таксама трохі працверазелі, а паколькі ўгаварыць яго спусціцца ніяк не атрымлівалася, дык пачалі раіцца, што нам рабіць далей, ці можна падвесці сюды пажарную машыну з драбінамі? Розныя думкі выказвалі Сляндзінскі, Хапэн, Квяткоўскі, нарэшце нехта з іх падказаў, што трэба пачаць кідаць камяні ў Балзука і тады ён спалохаецца і спусціцца ўніз. І вось вы пачалі працаваць. І сапраўды, Балзукевіч, чапляючыся за сцены, пачаў апускацца і праз нейкі час ужо шчаслівы стаяў на зямлі.

На наступны дзень Бэчковіч з біскупам Бандурскім вяртаўся на машыне ў Вільню і прапанаваў Ірэне паехаць з імі, што і адбылося. Мне давялося застацца, каб назіраць за экскурсіямі і завяршэннем цырымоніі.

Я мушу адзначыць яшчэ дзве вельмі важныя мясцовасці, з якімі я пазнаёміўся ці то ў 1929, ці то ў 1930 г.

Першая - Чомбрава, дзе можна ўбачыць Сапліцова з "Пана Тадэвуша". Мар'ян Карповіч, прафесар гісторыі мастацтваў Варшаўскага ўніверсітэта, нядаўна сказаў, што ў дзяцінстве ён бачыў мяне ў доме сваіх дзядулі і бабулі Карповічаў у Чомбраве. Я падзяляю думку прафесара Пігоня і Баравога, што ўспаміны Адама Міцкевіча аб гэтых мясцінах паўплывалі на фарміраванне паэтычнага бачання Сапліцова. Бо Чомбрава ён ведаў з дзяцінства - яго маці была дачкой чомбраўскага эканома, а суддзёва Узлоўская (Узлоўскія ў той час валодалі Чомбравам) была хрышчонай маці Адама Міцкевіча.

Другая мясцовасць - Мір. Замак (або руіны замка), сапраўды цудоўны, вялікі і прыгожа размешчаны. Гэты гатычны замак з пяццю вежамі пабудаваны ў пачатку XVI ст. і быў населены да першай паловы XIX ст. Занепаў толькі, калі перайшоў ад Радзівілаў да Вітгенштэйнаў. Замак быў выкуплены (не ведаю, калі) Мірскімі (напэўна рускай лініі), бо князь Міхал Святаполк-Мірскі, які з'яўляўся ўладальнікам Міра ў апошнія дваццаць гадоў і якога я ведаў, меў белую бараду і выглядаў, як тыповы расійскі саноўнік. Быў праваслаўным і нездарма да Першай сусветнай вайны займаў пасаду губернатара на




Каўказе. Адразу пасля вайны ён змяніў веравызнанне з праваслаўнага на каталіцкае, патлумачыўшы гэта тым, што ў Польшчы праваслаўныя - гэта толькі сяляне.

Пасля Першай сусветнай вайны Мірскі пасяліўся ў былой сядзібе адміністратара, адкрыў вялікую гаспадарку, цагельню, ткацкія варштаты, пабудаваў вінакурню і спіртзавод. А калі ў яго з'явіліся адпаведныя фінансавыя магчымасці, пачаў рэканструкцыю замка, у тым ліку і яго жылых памяшканняў. Праекты інтэр'ераў падрыхтаваў архітэктар Тэадор Буршэ. Мірскі, які пасяліўся ў замку, быў захоплены ім і жыў ідэяй аднаўлення замка, ён асабіста ўдзельнічаў у праектаванні рэканструкцыі. Князь купіў сабе Dictionnaire raisonny de l'architecture franeaise du XI-e au XVI-e siecle Viollet-le-Duc[3] (Віёлле-ле-Дзюк. Толковый словарь французской архитектуры XI-XVI века), з якога чэрпаў мадэлі для сваіх ідэй.

Мірскі прыняў мяне прыязна, але потым крыху расчараваўся. Пра свой прыезд я паведаміў лістом. Ён са здзіўленнем сказаў мне, што спадзяваўся ўбачыць сур'ёзнага старога чалавека. Я хутка зразумеў, што ён паспрабуе мяне праверыць. Аднойчы князь згадаў імя Віёле-ле-Дзюк і зірнуў на мяне, каб даведацца, ці значыць гэта для мяне што-небудзь. Я адразу пачаў з ім дыскусію наконт засцярог рэстаўратараў ад занадта рабскага пераймання задум Віёле-ле-Дзюка і ўбачыў, што ён пачаў мяне паважаць. Аднойчы князь Мірскі сказаў, што вялікая зала на першым паверсе была яго "белым сланом". Ён паглядзеў на мяне і спытаў, ці ведаю я, чаму ён назваў яе сваім "белым сланом". Я адказаў, што, гэта нешта абсалютна бескарыснае, вельмі дарагое і маніякальна жаданае. Мой адказ змяніў атмасферу размовы, і ён пачаў ставіцца да мяне роўна і па-сяброўску. Запрасіў на абед. Было вельмі смешна. За сталом сядзела пляменніца Наташа, адзін з двух яго пляменнікаў і яшчэ некалькі чалавек. Калі мы ўсе селі, урачыста ўвайшоў кухар у белым фартуху і ў высокім капелюшы, па камандзе князя ён зачытаў меню па-французску, але з такім мясцовым вымаўленнем, што разабраць яго было цяжка. Я вельмі хацеў убачыць гэтую старонку меню, але было непрыстойна прасіць яе.

Размова за сталом была для мяне вельмі няёмкай, у нейкі момант гаспадар сказаў што Наташа дурная. Пра свайго пляменніка ён сказаў, што той разбойнік і ён увесь час мае з ім непрыемнасці. Князя злавала, што яны нічога не разумеюць у справе адбудовы замка. Мірскі размаўляў па-польску з расійскім акцэнтам, напэўна, яшчэ горшым, чым у генерала Жалігоўскага. Пасля абеду ён размаўляў са мной крыху па-польску, крыху па-французску. Рассталіся мы вельмі сардэчна.

Я не верыў, што Мірскія здолеюць аднавіць для сабе ў замку жылыя апартаменты. І памыліўся. Незадоўга да вайны, верагодна, у 1937 ці 1938 г. Мірскія пераехалі ў замак[4].

За сем гадоў я добра пазнаёміўся з помнікамі і гістарычнымі мясцовасцямі Наваградскага ваяводства. Па ініцыятыве Слонімскага аддзела Польскага краязнаўчага таварыства у 1933 г. я нават выдаў "Слонімскія вандроўкі. Кароткі агляд даведнік па Слоніме і Альбярціне, Быцені, Дзярэчыне, Мерачоўшчыне, Ружанах, Сынкавічах, Дзятлаве і Жыровіцах".

Калі Бэчковіч пераехаў у Вільню, я страціў ахвоту да больш цесных кантактаў з Наваградкам, бо ў 1931 г. ваяводам стаў палкоўнік Костак-Бярнацкі[5]. У гэты час мне патэлефанавалі з Наваградскай ваяводскай управы з просьбай прыехаць у Навагрудак, каб прадставіцца новаму ваяводзе. Я зрабіў гэта па неабходнасці, але з агідай. Мой візіт да новага ваяводы быў толькі фармальнасцю. Яго не цікавіла ні захаванне помнікаў, ні культура. Ён быў тут ваяводам каля года, і, на шчасце, я больш не меў з ім кантактаў. Я не жадаў размаўляць з былым начальнікам жандармерыі легіёнаў і камендантам Берасцейскай цвердзі ў 1930 г., у якой тады была турма для апазіцыйных дзеячаў.

***Пераклад і каментары Леаніда Лаўрэша.***

[3]Эжэн Эманюэль Віёлле-ле-Дзюк (Eugene Emmanuel Viollet-le-Duc, 1814 - 1879) - французскі архітэктар, рэстаўратар, мастацтвазнаўца і гісторык архітэктуры, ідэолаг рэстаўрацыі помнікаў гісторыі. - *Л. Л.*

[4] Вось як апісаў рэдактар газеты "Лідская Зямля" сустрэчу з гаспадаром Мірскага замка ў 1938 г.: "Міхал князь Святаполк-Мірскі ў свае 70 гадоў мае рэзкае і чэрствае аблічча.

- Што спадароў прывяло да мяне? - задае першае пытанне.

- Прагнем нешта даведацца пра аднаўленне замка.

- Ну, што … Замак - гэта руіна. А другая руіна, калі спадарству цікава - ён лагодна ўсміхаецца і паказвае на сябе пальцам - гэта я… Работы па адбудове вяду 17 гадоў. За гэты час адбудаваў чатыры вежы і многа пакояў. Але не маю шмат грошай. Мае мажлівасці - адзін пакой у год. Сп. Прэзідэнт, калі быў у гасцях, сказаў: "Хто будуе - той не ўмірае". Таму, я яшчэ маю час.

У зале, дзе адбываецца аўдыенцыя, яшчэ захавалася першапачатковая столь, якую падпіраюць аркады калон. Пасля запісу нас у кнігу наведвальнікаў князь моцна паціскае нашы рукі.

Пакідаем замкавы дзядзінец разам з усім гэтым сярэдневяковым помнікам, і між волі ў галаву прыходзіць думка пра адвечную цягу чалавека да старажытнасці". - *Л. Л.*

[5] Вацлаў Костак-Бярнацкі (1884 - 1957), дзяржаўны дзеяч міжваеннай Польшчы, паплечнік Пілсудскага.

У 1930 г. Костак-Бярнацкі быў прызначаны камендантам Берасцейскай цвердзі, якая служыла турмой для палітвязняў, праціўнікаў Пілсудскага, у тым ліку асуджаных былых парламентарыяў. З 1 ліпеня 1931 па 8 верасня 1932 г. быў ваяводам Наваградскага ваяводства, а з 8 верасня 1932 па 2 верасня 1939 г. - ваяводам Палескага ваяводства. Пры ім нацыянальная палітыка польскіх уладаў на Палессі набыла выразны асіміляцыйны і рэпрэсіўны характар. Ён быў адным са стваральнікаў лагера жорсткага рэжыму ў Бярозе - *Л. Л.*

Станіслаў Лорэнц

# Віленскі альбом

## (Вільня, творчая інтэлігенцыя, краёўцы)

Я выехаў з Варшавы ў Вільню разам з Рэмерам увечары 17 студзеня 1929 г. вельмі камфартабельным хуткім цягнікам, які пасля васьмі гадзін шляху, прыбыў у Вільню на наступны дзень каля сямі раніцы. Наступныя сем гадоў я быў частым пасажырам гэтага цягніка, і заўсёды, каб дабрацца з Вільні да Варшавы, патрабавалася ўся ноч. Пра наш прыезд у Вільню паведаміў віленскі друк: *"18 студзеня ў Вільню прыбылі генеральны кансерватар Ежы Рэмер і доктар Станіслаў Лорэнц, які зойме пасаду кансерватара і кіраўніка дэпартамента мастацтваў у Віленскай ваяводскай управе"*.

Калі я ад'язджаў у студзені, Ірэна (жонка - *Л. Л.*) засталася ў Варшаве і праз тры месяцы павінна была пераехаць у Вільню. Пасяліўся я часова ў гасцінным пакоі ваяводскай управы на вул. Вострабрамскай. А паколькі неўзабаве пачаўся перыяд выключна вялікіх маразоў, да -35° С, мне было вельмі холадна. Таму ўдзень і ўвечары я часта сядзеў у найбуйнейшай віленскай кавярні, у "Чырвоным Штралі"[1] ("Czerwony Sztrall") на вуліцы Міцкевіча. Добра памятаю тагачасны шлягер, які аркестр іграў тут кожны дзень, у ім меўся наступны прыпеў "І цалую вашу руку, мадам".

Адразу 18 студзеня Рэмер пазнаёміў мяне з ваяводам Уладзіславам Рачкевічам (пазней апошнім прэзідэнтам РП у выгнанні). Гэта было зроблена праз сакратарыят. Абавязкі сакратара тады выконваў былы землеўладальнік Станевіч, а пасля яго два браты Вэндорфы. Кабінет ваяводы размяшчаўся ў вялікім вуглавым памяшканні на першым паверсе (рог Катэдральнай плошчы і вуліцы Замкавай). Візіт меў фармальны характар. Пазней Рэмер з усмешкай распавядаў мне, што Рачкевіч спытаў яго, ці ўпэўнены ён, што ў мяне ёсць атэстат аб сярэдняй адукацыі. Я меў 29 гадоў і сапраўды выглядаў вельмі молада.

У той ці на наступны дзень мы наведалі і Фердынанда Рушчыца ў яго кватэры па вул. Замкавая, 24, кв. 8. Гэты дом быў набыты ўніверсітэтам на пачатку XIX ст. і ператвораны ў "медыцынскі калегіюм". Частку будынка займалі апартаменты прафесараў медыцыны, у тым ліку ў левым флігелі жыў Аўгуст Бекю[2]. Тут таксама жыў малады Юліюш Славацкі. У 1927 г. у сцяну флігеля была ўмуравана мемарыяльная дошка, а двор быў названы яго імем. Прафесар Рушчыц з сям'ёй як раз жыў у былой кватэры доктара Бекю.



*Уладзіслаў Рачкевіч, віленскі ваявода, фота каля 1930 г.*

Візіт да прафесара Рушчыца меў у пэўнай ступені сімвалічны характар. Гэта было ўсяроўна, як акрэдытаваць мяне ў самага выбітнага прадстаўніка старой Вільні, амбасадара яе культуры, вядучага прадстаўніка віленскай думкі. Але Рушчыц быў не толькі "тутэйшым" на Віленшчыне, але і вельмі знаным жывапісцам і сцэнографам, крыніцай яго творчасці стала вучоба ў Шышкіна і Куінджы ў Пецярбургскай акадэміі. Потым ён заснаваў Школу прыгожых мастацтваў у Варшаве і два гады чытаў там лекцыі, потым тры гады быў прафесарам Акадэміі прыгожых мастацтваў у Кракаве, належаў да таварыства "Штука". Як бачым, ён займаў выключнае месца ў мастацкім свеце.

На пачатку 1908 г. Рушчыц вырашыў пасяліцца ў Вільні. Неўзабаве тут ён пачаў супрацоўнічаць з віленскім

[1] Кавярня Баляслава Штраля, папулярная сярод творчай інтэлігенцыі Вільны яшчэ да 1914 г. У ёй бывалі і браты Луцкевічы і Янка Купала і інш. - *Л. Л.*

[2] Аўгуст Бекю (польск.: August Ludwik Becu; 1775, Гродна -1824, Вільня) - вучоны-гігіеніст, прафесар Віленскага ўніверсітэта, айчым паэта Юліюша Славацкага. - *Л. Л.*

pawet.net

тэатрам, які толькі што адрадзіўся. Кіраўніком тэатра была Нуна Младзяёўская-Шчуркевіч а адным з маладых акцёраў Юліюш Остэрва. Паміж імі наладзілася самае цеснае супрацоўніцтва. Іх сумесныя пастаноўкі і дэкарацыі сталіся вялікімі падзеямі ў Вільні першых гадоў XX ст.

Мастацкая дзейнасць Рушчыца была вельмі разнастайнай, прыгадаем, напрыклад, серыю з васьмі жывых карцін у тэатры "Лютня" ў 1911 г., складзеную паводле карцін англійскіх прэрафаэлітаў, спектаклі для дзяцей "Свет казак", "Вечар паэзіі", ці клопат, якім ён атачаў моладзевы "Гурток Мастацтва". Яго кватэра (у той час - Зарэчча, 24) была жывым асяродкам культурнага жыцця.

Пра тое, што ён ніколі не парываў з Варшавай, сведчыць знакамітая сцэнаграфія Рушчыца да "Баладыны" ў Польскім тэатры ў 1914 г. Яго дзейнасць як тэатральнага дэкаратара завяршалася цудоўнымі дэкарацыямі да "Лістападаўскай ночы" ў 1930 г.

У 1922 г. на Віленскім сойме Сярэдняй Літвы Рушчыц прагаласаваў за ўключэнне Вільні ў склад Польшчы. У той час ён быў неафіцыйным прадстаўніком польскай культуры перад замежнымі місіямі і высокапастаўленымі асобамі, таксама і ў наступныя гады ён меў вялікую павагу ў гэтай ролі.

Рушчыц не меў літаратурных схільнасцей і не быў прамоўцам. Але, магчыма, будзе добра, калі я працытую яго ўласныя словы пра Вільню з яго рэдкіх выступленняў і артыкулаў: *"Горад з дзіўнай, загадкавай прывабнасцю і незнішчальнай прыгажосцю", "нельга застацца абыякавым перад чароўнасцю пагоркаў, якія акружаюць даліну і перасякаюцца выгінамі дзвюх рэк, з'яўляюцца і зноў знікаюць у далячыні Віліі і Вілейкі", "таямнічая чароўнасць Вільні і жывапісны пейзаж", "мелодыя чароўнасці Вільні", "спеў у лініях і колерах Вільні", "горад высокіх вежаў".*

У тыя першыя дні мы наведалі таксама і сябра Рушчыца, Яна Булгака. У сваіх успамінах пра Рушчыца ў кнізе водгукаў, выдадзенай у 1939 г., Булгак пісаў, што абавязаны яму "*лепшымі гадзінамі свайго жыцця*". І, хіба, так і сапраўды было, бо Рушчыц з гэтага абшарніка з Навагрудчыны і фатографа-аматара, зрабіў прафесійнага фатографа і фатографа-мастака. Рушчыц арганізаваў выставу яго фатаграфій у Менску ў 1911 г. У тым жа годзе ў маёнтку Рушчыца Багданава на Ашмяншчыне, як напісаў Булгак ў кнізе: *"Рушчыц паказаў мне ўзгорак з ельнікамі на тле далягляду - знаёмы гарбаты сілуэт, знаёмы кожнаму, хто памятаў пафасную лінію гарызонту ў Рушчыцавай "Зямлі""*.

Па ініцыятыве Рушчыца Булгак заснаваў у 1912 г. у Вільні фатаграфічную майстэрню, галоўнай задачай якой была інвентарызацыя помнікаў віленскай архітэктуры паводле ўказанняў Рушчыца. "Фатаграфаваць сэрцам" - такі быў дэвіз Рушчыца, якога прытрымліваўся Булгак. *"Рушчыц на кожным кроку Вільні меў свае любімыя куткі, куды ён мяне прыводзіў і раскрываў тайну іх прыгажосці [...] Я ішоў па яго слядах, вучыўся ўлоўліваць яго пачуцці і знаходзіць свае"*, - успамінаў Булгак. *"Часам да нашых блуканняў далучаўся і Вацлаў Студніцкі[3], якому я таксама павінен падзякаваць за тыя гады. Студніцкі быў жывым летапісам гісторыі старой Вільні"*. Цягам некалькіх гадоў Булгак стварыў уражлівы фатаграфічны вопіс Вільні і Віленскага краю, які налічвае, напэўна, больш за 6000 фотаздымкаў. Падчас майго візіту да яго (пляц Ажэшкі, 3) ён паказаў мне свой фотаархіў.



***Прафесар Юліюш Клос***

Справа кансервацыі і інвентарызацыі помнікаў хутка па-сяброўску звязала мяне з праф. Клосам[4] і Булгакам. І нягледзячы на значную розніцу ва ўзросце, мы называлі адзін аднаго па імёнах. З 1919 г. Булгак быў кіраўніком майстэрні мастацкай фатаграфіі на факультэце прыгожых мастацтваў універсітэта імя Стэфана Баторыя.

У наступныя тыдні я наведаў архіварыюса горада

[3] Па ўспамінам Пятраса Клімаса, менавіта фізічная бойка паміж Іванам Луцкевічам і Вацлавам Студніцкім у "Чырвоным Штралі" прывяла да адыходу братоў Луцкевічаў ад краёвай ідэі. - *Л. Л.*

[4] Юліюш Клос (1881, Варшава - 1933, Вільня) - архітэктар, фатограф, гісторык архітэктуры, прафесар універсітэта Стэфана Баторыя.





Вільні Вацлава Гізберта-Студніцкага (брата Уладзіслава[5]) і Міхала Брэнштэйна[6], да якога ў мяне быў рэкамендацыйны ліст ад прафесара Батоўскага. Брэнштэйн быў куратарам аддзела рукапісаў універсітэцкай бібліятэкі. Ён шмат гадоў правёў у Жамойці і стаў лепшым знаўцам гісторыі, этнаграфіі, статыстыкі і помнікаў роднай Жамойці. Бібліяграфія яго прац у гэтай галіне і па цэлым Вялікім Княстве Літоўскім складала больш за 600 адзінак і ён справядліва атрымаў ступень ганаровага доктара Універсітэта Стэфана Баторыя. Паміж намі склаліся вельмі добрыя адносіны, чаму спрыялі пачуццё гумару Брэнштэйна і яго тонкі розум. Ён любіў жартаваць. Запомніўся яго аповед, як у канцы XIX ст. ў Панямуні (Брэнштэйн нарадзіўся і доўгі час жыў у Тэльшах на Жамойці) ён стаў прыхільнікам барацьбітоў з алкагалізмам. На вялікім сходзе было вырашана стварыць таварыства цвярозасці. Пасля агульнага сходу, арганізавалі сумесны абед у рэстаране. Пасля гэтай вячэры членаў антыалкагольнага таварыства слугі разносілі па-дамах. Перад смерцю (у 1938 г.) ён праявіў да мяне добразычлівасць бо запавядаў Нацыянальнаму музею свой вельмі каштоўны залаты гадзіннік, зроблены у XIX ст. Аляксандрам Радніцкім, з відам Вострай Брамы, выгравіраваным з аднаго боку, і Троцкага возера з лодкай на пярэднім плане, з другога боку.

Адразу пасля прыезду ў Вільню я завязаў кантакты з людзьмі, якія былі неабходны мне прафесійна. Праз Брэнштэйна я ўвайшоў у кантакт з Віленскім таварыствам сяброў навукі, з музейнымі калекцыямі Таварыства і з прафесарам Станіславам Касцялкоўскім[7], чыя высакародная жыццёвая пазіцыя усімі высока цанілася. Скончыў ён сваё жыццё старэйшым членам Акадэмічнай супольнасці Лонданскага ўніверсітэта Стэфана Баторыя. Я рады, што машынапіс яго вялікай працы пра Антонія Тызенгаўза, які быў перададзены мне на захаванне падчас вайны, я захаваў і вярнуў прафесару Касцялкоўскаму ў пасляваенныя гады ў Лондане. Манументальная двухтомная манаграфія пра Тызенгаўза была выдадзена Акадэмічнай супольнасцю ўніверсітэта Стэфана Баторыя ў Лондане ў 1970 г.

Я не шукаў кантакту з элітарным асяроддзем шляхецкага паходжання, выдатнымі прадстаўнікамі якога былі Аляксандр Мяйштовіч[8] (бацька ксяндза Валяр'яна Мяйштовіча, выбітнага выдаўца ў Рыме крыніц па гісторыі Польшчы з Ватыканскіх архіваў) і прафесар Мар'ян Здзяхоўскі[9].

Мяйштовіч, прыхільнік пагаднення з царом, "кацярынец", гэта значыць удзельнік цырымоніі адкрыцця помніка Кацярыне II у Вільні ў 1904 г. за што быў ўганараваны годнасцю "камер-юнкера", быў непрыемнай для мяне постаццю, нягледзячы на тое, што ў Польшчы даслужыўся нават да пасады міністра. Аднойчы я быў на вечарыне ў Здзяхоўскага, які карыстаўся вялікай павагай і прызнаннем у Вільні. Але гэты віленскі сепаратыст, "тутэйшы", які вагаўся паміж хрысціянствам Шатобрыяна і Яснай Палянай Талстога, не быў мне сімпатычным, быў ён расійскім славянафілам[10].

[5] Юзаф Мацкевіч пісаў: "Прафесар Уладзіслаў Гізберт-Студніцкі (у апошнія гады ён абмяжоўваўся толькі другой паловай прозвішча) родам быў з Лівоніі і ўсёй сваёй істотай належаў XIX ст. "Прафесарам" яго назвалі пазней па трох прычынах: па-першае, некаторы час ён выкладаў у віленскім Інстытуце вывучэння Усходняй Еўропы; па-другое, гэтае званне падыходзіла яму па ўзросту; па-трэцяе, ён быў па-прафесарску рассеяны. Аб яго няўважлівасці хадзіла мноства гісторый. У яго быў брат Вацлаў, віленскі архіварыюс. Таксама нізенькі, падобны на брата, нібы блізнюк, і таксама рассеяны. Аднойчы, пасля збору Таварыства сяброў навук, Студніцкія пераблыталі паміж сабой свае паліто. Іншых такіх жа кароткіх паліто больш у раздзявальні не было. Заўважылі яны гэта, толькі калі выйшлі разам і ўжо рухаліся ў паліцэйскі ўчастак падаваць скаргу аб крадзяжы паліто. Можа, гэта і анекдот: хто б з-за такога пайшоў у паліцыю? Але вось праўдзівы выпадак. Раз, калі Студніцкі ехаў на рамізніку, ён раптам нешта ўспомніў, спыніў рамізніка, сышоў і накіраваўся ў адваротны бок. Рамізнік павярнуў каня і паслухмяна рухаўся ўздоўж тратуара, мяркуючы, што гэта такі прафесарскі капрыз. Толькі на трэцяй вуліцы ён звярнуўся: "Паночак, а дакуль гэта будзе?" Узнік буйны скандал, бо Студніцкі быў упэўнены, што ўвогуле ні на якім рамізніку не ехаў. У рэдакцыю ён, бывала, з'яўляўся ў крухмаленым каўнерыку, але без прышпіленага гальштука..."- цыт па: Культура. 1965. №12. - *Л. Л.*

[6] Міхал Яўстахі Брэнштэйн (1874 г. у Тэльшах - 1938 г. у Вільні) - бібліятэкар, бібліяфіл, гісторык, археолаг і этнограф-аматар. - *Л. Л.*

[7] Станіслаў Касцялкоўскі (1881 г. у Гародні - 1960 г. у Пітсфард-Холе каля Нортгемптана, Вялікабрытанія) - гісторык, даследчык гісторыі Літвы, прафесар Віленскага ўніверсітэта Стэфана Баторыя. - *Л. Л.*

[8] Аляксандр Мяйштовіч (1864 у Ковенскай губерні - 1943, Рым) - палітычны і дзяржаўны дзеяч. Віца-старшыня Ковенскага таварыства сельскай гаспадаркі (1900-1904), дэпутат (1909-1917) ад Ковенскай губерні ў Дзяржаўны Савет Расійскай імперыі, старшыня (1921-1922) Часовай урадавай камісіі Сярэдняй Літвы, шматгадовы старшыня Віленскага зямельнага банка. У Польшчы быў міністрам юстыцыі (1926-1928) у кабінетах Юзафа Пілсудкага і Казіміра Бартэля. У 1905-1911 гг. быў прыхільнікам ідэй "краёвасці" і фінансаваў выданне газеты "Кур'ер Літоўскі", у 1918-1939 гг. быў адным з лідараў "віленскіх кансерватараў". - *Л. Л.*

[9] Мар'ян Эдмундавіч Здзяхоўскі (1861, Ракаў - 1938, Вільня) - публіцыст, літаратуразнавец і філосаф, рэктар Універсітэта Стэфана Баторыя (1925-1926). - *Л. Л.*

[10] Пра прафесара Мар'яна Здзяхоўскага з вялікай павагай пісаў Антон Луцкевіч. Гл: Nowina. O duszy bialoruskiej Syrokomli // Preglad Wilenski. 1937. № 9. S. 5-6. (у маім перакладзе: Луцкевіч Антон. Аб беларускай душы Сыракомлі / / Наша слова.pdf № 5 (57), 1 лютага 2023.) - *Л. Л.*



***Злева на права: Ян Булгак, Станіслаў Лорэнц, Юліюш Клос, 1930 г.***

Пра віленскіх і навагрaдскіх землеўладальнікаў я не меў аніякага паняцця. Добра памятаю, што пісаў Булгак, сам абшарнік, у "размовах з Рушчыцам": *"...аднойчы, пасля тэатра [у 1913 г.], мы з Рушчыцам апынуліся ў кабарэ Шумана ў бернардынскім садзе. Было гэта месца дзе жыла муза ўзроўню расійскага унтэрафіцэрства, узроўню, характэрнага для тых часоў і для ўсяго, што культывавала у той час у нашым краі [...] Не перашкаджала гэтаму тое, што тут прапівалі высокія заробкі расійскія чыноўнікі і свае магнацкія багацці нашы абшарнікі, якія задавалі тон у тагачаснай Вільні"*.

Вільня ў тыя часы была адзіным горадам, дзе не існавала праблем з жытлом. Заўсёды былі свабодныя кватэры, і яны здаваліся па нармальным кошце.

Мой мастацкі аддзел пры ваяводскай управе займаў зусім асобную частку будынка. Трапіць сюды можна было не праз галоўны ўваход, а з Саборнай плошчы праз браму ў бакавы двор, адтуль па сходах кухоннага тыпу на другі паверх. Аддзел меў тры пакоі: мой кабінет, вялікі кабінет, дзе сядзелі Лапалеўскі і Шрам (Шрамаўна), і пакой, у якім ствараліся фота- і дакументальныя архівы, а таксама захоўваліся справы помнікаў.

У 1928 г. Тадэвуш Лапалеўскі толькі што выдаў кнігу паэзіі пад назвай "Прыгожая вандроўка", у ёй мелася некалькі вершаў, прысвечаных Вільні. Ён быў маім намеснікам, але большасцю штодзённых спраў займалася Шрам. Мы не надта перашкаджалі Тадэвушу ў яго больш сур'ёзнай працы, напрыклад, у напісанні ў 1931 г. добрага рамана "Правінцыялы". У нас з жонкай хутка склаліся сардэчныя асабістыя адносіны з Лапалеўскімі.

Тадэвуш Лапалеўскі завяршыў нашу гісторыю ў тых краях прыгожай кнігай, выдадзенай у познаньскай серыі Вэгнера, пад назвай "Паміж Нёманам і Дзвіною - Віленска-Навагрaдская зямля". На падараваным мне ў лютым 1939 г. асобніку кнігі ён напісаў прысвячэнне: *"Майму любімаму Стаху на памяць аб нашых агульных шпацырах па Вільні, Навагрудку і Слоніму, са шчырым сяброўствам"*.

Выдатнай асобай была Гелена Шрам, мастачка-жывапісец з Падгужжа Карпацкага, дачка прафесара Ягелонскага ўніверсітэта, якая вучылася ў Кракаве, Мюнхене і Парыжы. Цікавілася сярэднявечным жывапісам, а пасля вяртання ў Польшчу - народным мастацтвам. У пачатку 1920-х гг. разам з Зоф'яй Бадуэн дэ Куртэнэ займалася касцельнымі паліхроміямі і пачала маляваць на шкле. У 1925 г. пераехала ў Вільню працаваць на факультэце мастацтваў. Вялікую актыўнасць мела ў "Таварыстве падтрымкі народнай прамысловасці" і ў "Базары народнай прамысловасці ў Вільні".

У ваяводскай управе я ў першыя дні сустрэў важных людзей. Віца-ваявода Кіртыкліс - былы маёр жандармерыі, быў непрыемным чалавекам, і яго жонка Яніна, старшыня "Грамадзянскай працы жанчын", нам таксама не спадабалася. Гэта былі людзі невысокага культурнага ўзроўню, абое звязаныя з "двойкай" генеральнага штаба[11]. Блізкія службовыя стасункі склаліся ў мяне былі з начальнікам Адміністрацыйнага дэпартамента Дваракоўскім, кіраўніком Дэпартамента аховы здароўя доктарам Рудзінскім (бацькам кампазітара), ахвотна дапамагаў мне дырэктар грамадскіх работ Сіла-Навіцкі. Інтэлігентам быў радца Віктар Пятровіч (аддзел веравызнанняў) і радца Міхал Паўлікоўскі[12]. Гэты, апошні, землеўладальнік з Меншчыны, выдатны паляўнічы, быў рэдактарам дадатка газеты "Слова" Мацкевіча пад назвай "Дзе, ах дзе трубы паляўнічыя граюць". У эміграцыі ён апублікаваў свае ўспаміны пад назвай "Дзяцінства і юнацтва Тадэвуша Ірценьскага" (Лондан, 1959 г.).

Мае адносіны з ваяводскай управай былі даволі свабоднымі, бо ваяводзе я падпарадкоўваўся толькі ў адміністрацыйных справах, а непасрэдна быў падпарадкаваны Міністэрству Веравызнанняў і Асветы.

***Пераклад і каментары Леаніда Лаўрэша.***

*(Працяг у наступным нумары.)*

[11] Другі аддзел Генеральнага штаба (да 1928 г.), потым Галоўнага штаба - вайсковая выведка. - *Л. Л.*



№ 38 (90) 20 ВЕРАСНЯ 2023 г.
наша СЛОВА.pdf

*Станіслаў Лорэнц*

# Віленскі альбом

## (Вільня, творчая інтэлігенцыя, краёўцы)

*(Працяг у наступным нумары.)*

У красавіку 1929 г. я быў ужо дастаткова дасведчаны, каб даць інтэрв'ю Стэфану Клачыньскаму з "Кур'ера Віленскага" аб маіх далейшых планах па кансервацыі помнікаў гісторыі. У першую чаргу я згадаў пра рэстаўрацыю посттрынітарнага касцёла Езуса на Антокалі, пабудаванага на рубяжы XVII - XVIII стст. Гэты прыгожы храм з вялікім купалам, меў унутры шыкоўную ляпніну, якая ў мастацкім сэнсе нібы працягвала тую, якая ўпрыгожвала касцёл Святых Пятра і Паўла на Антокалі. У 1864 г. Мураўёў перарабіў гэты касцёл на царкву св. Міхаіла ўніверсітэцкай дэрматалагічнай клінікі - царква выкарыстоўвалася, як шпіталь. Мы вырашылі пачаць рэстаўрацыю з выдалення рускіх цыбулін з абедзвюх вежаў і ліхтароў купала, што было зроблена пад кіраўніцтвам праф. Клоса ў 1929 г. Форма даху над усім купалам была аднаўлена да першапачатковага выгляду, заснаванага на старых выявах. Праца над посттрынітарным касцёлам была сустрэта грамадствам вельмі прыхільна. Мураўёўскія дадаткі ліквідавалі, прыгожаму барочнаму храму надалі належны выгляд.

З рэлігійных помнікаў у інтэрв'ю я згадваў і касцёл Усіх Святых па вул. Рудніцкай, дзе я праектаваў кансервацыю каштоўнай барочнай ляпніны ў прасбітэрыі, і старую царкву св. Барыса і Глеба (па-базыльянскую) у Навагрудку. З задавальненнем успамінаю, што ўжо ў тыя першыя месяцы я зрабіў некаторыя крокі, каб пачаць работы па кансервацыі ў цудоўным касцёле ў стылі ракако ў Беразвеччы, які знаходзіўся пад апекай ваеннага начальства. Гэты цікавы базыльянскі храм несумненна з'яўляўся творам найвялікшага віленскага архітэктара сярэдзіны XVIII ст. Яна Крыштафа Глаўбіца, пабудаваны ён у 1756-1763 гг. і пасля скасавання уніі паступова пачаў прыходзіць у заняпад. У 1901 г. царкоўна-манастырскі комплекс быў перададзены праваслаўным манашкам. Пасля вайны тут размяшчаўся Корпус аховы памежжа. У 1930 г. у ходзе кансервацыйных работ была выяўлена паліхромія сцен у стылі ракако. У наступныя гады праца ішла павольна. На жаль, пасля вайны комплекс зноў прыйшоў у заняпад і быў зруйнаваны.

Сярод жывапісных твораў адзначу насценныя і скляпеністыя роспісы Вастрабрамскага касцёла св. Тарэзы. У 1928 г. пачалася кансервацыя інтэр'еру касцёла і аб'яўлены яе працяг. А ў снежні 1930 г. работы па добраўпарадкаванні, якія праводзіў Марыян Сланецкі, былі завершаны. Касцёл выглядаў і выглядае цудоўна. У той час паміж мной і вастрабрамскім пробашчам кс. канонікам Савіцкім усталяваліся вельмі добрыя адносіны. Ён мне часам скардзіўся: "Ты ў касцёле паводзіш сябе прыстойна, а Сланецкі, там, на рыштаваннях, заўжды на галаве мае берэт (таму што ён быў зусім лысы), і я падазраю, што часам нават курыць цыгарэты". Кс. Савіцкі некалькі разоў запрашаў мяне да сябе на вячэру. Неяк казаў мне: "Ты - евангеліст - ну, гэта дрэнна. Але самае горшае, што ты недавярак". Я ціха выслухаў гэтыя заўвагі. Я таксама сябраваў з сакрыстыянам. Ён піў не гарэлку і не самагонку, а дэнатурат, у які яшчэ нешта падліваў. Пасля такога напою ўнутры ўсё буркатала. Тады ён крычаў: "Вось, бачыш, чорт уцякае", - і настойліва раіў мне пакаштаваць трунак, бо толькі такая гарэлка мае сапраўдны смак! Але я не хацеў рызыкаваць.

У інтэрв'ю "Кур'еру Віленскаму" я абвясціў, што буду дамагацца, каб Гарадскі архіў (Вацлаў Студніцкі) выехаў з былога францысканскага касцёла, канфіскаванага Мураўёвым у 1864 г., і вярнуў будынкі ордэну. Праз некалькі гадоў так і сталася, і францішкане вярнулі свайму касцёлу першапачатковы выгляд.

Самай важнай у маім інтэрв'ю была інфармацыя пра шматлікія кансервацыйныя работы ў Троцкім замку. Узгадваліся таксама і руіны на Замкавай гары ў Навагрудку. Абвешчаны быў конкурс на аздабленне руін вежы на Замкавай гары ў Вільні.

У красавіку 1929 г. я прачытаў серыю лекцый пра Вільню - мы чакалі вялікага турыстычнага руху ў Вільні ў сувязі з паездкамі, арганізаванымі з нагоды Агульнай нацыянальнай выставы ў Познані, я таксама ініцыяваў цыкл лекцый пра Вільню з удзелам прафесараў Рушчыца, Клоса, Рыдзеўскага, Ліманоўскага, кс. Слядзеўскага і дыр. Студніцкага

Нарэшце, прыкладна ў той жа час я звязаўся з Антонам Луцкевічам, куратарам Беларускага музея імя Яна Луцкевіча, які знаходзіўся ў пабазыльянскіх мурах па вул. Вострабрамскай. З літоўцамі я не мог наладзіць інстытуцыянальныя сувязі, бо ў іх не было цэнтра, з якім можна было ўсталяваць кантакт.

Цяпер, у красавіку 1929 г., я адчуў, што ў маім жыцці адбылася карэнная перамена. Перада мной адкры-

[12] Міхал Крыспін Паўлікоўскі (1893, Ігуменскі павет - 1972, Гаваі, ЗША), празаік, журналіст і мемуарыст. Адносіўся да палітычнай групоўкі "віленскіх кансерватараў". Атрымаў празванне "Храніст Вялікага Княства Літоўскага". Стрыечны брат рэдактара газеты "Слова" Станіслава Мацкевіча. - *Л. Л.*

pawet.net

лася шырокая дарога, і я атрымаў усе магчымасці праявіць ініцыятыву не толькі ў плане кансервацыі помнікаў, але і ў розных іншых галінах культуры. Я каментаваў чужыя ідэі, надаваў ім форму, і ад мяне ў шмат чым залежала рэалізацыя праектаў. Я адчуваў сябе свабодным, вольным і патрэбным. Мне толькі што споўнілася 30 гадоў, і я быў шчаслівы.

У наступным месяцы для мяне вялікім вопытам стаў удзел у чатырохдзённай вандроўцы ваяводы Рачкевіча па чатырох паветах ажно да Заходняй Дзвіны, да мяжы з Латвіяй. Асабліва мяне зацікавіў Браслаўскі павет, у тым ліку Друя і Лявонполь на Дзвіне. Таму, калі летам 1929 г. Цэнтральная інвентарная ўправа пры Міністэрстве распачала палявыя работы, я прапанаваў уключыць у праграму і Браслаўскі павет. Летам 1929 г. па павеце мы ездзілі разам: Юліуш Клос, Ян Булгак і я. У той час Булгак зрабіў папярэднюю фатаграфічную інвентарызацыю найважнейшых помнікаў, а мы з Клосам дамовіліся аб тым, якія з помнікаў архітэктуры трэба старанна абмераць. Нашым апорным пунктам стала Друя, дзе мы здымалі вялікі пакой на першым паверсе драўлянага дома з балконам. Мы вырашылі, што ў наступным годзе пачнём з Друі. Так яно і здарылася. У 1930 г. я даручыў Вітольду Кяшкоўскаму кіраўніцтва ўсёй інвентарызацыяй, а Клос са сваіх студэнтаў сабраў каманду для вымярэння, якой сам і кіраваў. На жаль, завяршыць інвентарызацыю помнікаў Браслаўскага павета не ўдалося, і да вайны не быў выдадзены надрукаваны вопіс. Толькі ў 1938 і 1939 гг. былі надрукаваны два павятовыя інвентары, але гэта былі Наватарскі і Раўска-Мазавецкі паветы. Нашы сумесныя паездкі на ваяводскім "Фордзе" па Браслаўшчыне моцна зблізілі мяне, Клоса і Булгака. Булгак тады навучыў мяне спяваць модную кабарэтную песню:

*Я гляджу на тваё фота,*
*якое ты мне сёння даслала...*

У сярэдзіне 1929 г. пасля бліжэйшага знаёмства з помнікамі ў абодвух ваяводствах, я прыйшоў да высновы, што самая актуальная задача - выратаваць руіны сярэднявечных замкаў і не дапусціць не толькі іх наўмыснай разборкі і няправільнага выкарыстання, але і натуральнага працэсу разбурэння, які прагрэсуе з цягам часу. Я ацаніў стан усіх руін замка ў Троках, Замкавай гары ў Вільні, Наваградку, Медніках, Крэве і Лідзе як вельмі дрэнны, нават небяспечны. Толькі ў Міры дзякуючы прыватніку ўдалося спыніць разбурэнне гістарычных руін. Самы прыгожы замкавы комплекс быў, вядома, у Троках. І ў той жа час іх прыгожае размяшчэнне на востраве і на беразе возера Гальвэ, сярод чароўнага ландшафту і ўсяго за 28 км ад Вільні, з першых дзесяцігоддзяў XIX ст. зрабіла Троцкі замак вельмі ажыўленым. Яго малявалі Смакоўскі і Маршэўскі, малявалі Шолма, Жамэ і Баляслаў Русецкі, дзве алейныя карціны з відам замкавага вострава ў 1846 г. напісаў Крысціян Брэслаўэр.

Эдвард Паўловіч ва "Успамінах з-пад Віліі і Нёмна", расказваючы пра паездку са сваімі акадэміцкімі калегамі ў Трокі ў 1839 г., піша: *"Жывучы ў Вільні, я часам дакараў сябе, што не быў у Троках; бо, па-мойму, быць у Вільні і не ведаць Трокаў - гэта ўсё роўна, што быць у Рыме і не бачыць папы"*. Прайшоўшы дарогу з Вільні ў Трокі, Паўловіч з калегамі спыніліся на начлег у карчме каля мястэчка. Выйшлі з хаты: *"Адкуль [.. .] адкрываўся чароўны від на Трокі. Гэта, бадай, адзіная кропка, з якой гэтая старая сталіца Літвы выглядае як найлепш. На пярэднім плане, уверсе, касцёл і кляштар бернардзінаў [.. .] далей старадаўні парафіяльны касцёл, потым горад, які купаўся ў водах возера, а далей сярод сіняй бліскучай прасторы, на адным з астравоў, маляўнічыя руіны замка з зубчастымі чырвонымі вежамі, напалову заслоненыя ранішнім туманам. І ўсё купалася ў яркім святле заходзячага сонца. Адзін гэты выгляд варты пілігрымкі ў сталіцу Кейстута!"*

Чырвоныя руіны муроў у маляўнічым ландшафце, азёры, экзотыка караімаў, белы палац Тышкевічаў у Затроччы на беразе возера, памяць гісторыі, вялікі князь Вітаўт, кароль Казімір Ягелончык, усё гэта зачаравала Вільню Трокамі. Таму пачатак кансервацыйных работ у Троках высока ацанілі ў Вільні. Прэса паведамляла, што: *"З-за дрэннага стану руін замка на востраве ў Троках ахоўныя органы вырашылі распачаць умацаванне руін. Гэтая праца пачалася 1 ліпеня* [1929 г.]. *Кіраўніцтва працамі было даручана архітэктару Яну Бароўскаму"*. А эндэцкі "Дзённік Віленскі" пісаў: *"Кансерватарская кантора ў Вільні з невялікім персаналам дэманструе выдатную мабільнасць. Бліжэйшымі днямі яна распачынае кансервацыю руінаў Троцкага замка, слушна скіроўваючы на гэту працу пільную ўвагу і максімум даступных сродкаў* [пакуль гэта было дзесяць тысяч злотых, якія я пазычыў на прыватны рахунак у віленскага Гаспадарчага краёвага банка]. *Трэба сказаць, што ў часы былога кансерватара Рэмера гэтыя каштоўныя руіны былі закінуты і цалкам занядбаны"*.

Асноўным меркаваннем, з якога я сыходзіў перад пачаткам работ, была думка, што замак у Троках трэба толькі захаваць, а не перабудоўваць. Гэта адпавядала агуль-апрынятым прынцыпам - руіны сярэднявечных замкаў, мёртвыя помнікі - не павінны быць рэканструяваны. Мэта іх кансервацыі - выявіць тыя фрагменты, якія схаваны ў завалах, і абараніць руіны ад далейшага разбурэння. Вядома, каб абараніць большае цэлае або захаваць тое, што знікае, у некаторай ступені можа спатрэбіцца і рэканструкцыя фрагментаў. Так, напрыклад, у замку на востраве ў Троках, у замкавай вежы, у насыпе былі знойдзены выхад са скляпення брамы і прыступкі ўваходных праёмаў. З-за таго, што на іх абапіраюцца руіны вежы, а таксама, каб захаваць у першапачатковым выглядзе сувязь выхадаў з памяшканнямі, лесвічныя выхады ў памяшканне першага паверха вежы былі рэканструяваны. Пасля вычарпання запасаў старой цэглы, здабытай з-пад завалаў, была замоўлена новая цэгла выдатнай якасці, якая, як і старая гатычная цэгла, была цёмна-вішнёвага колеру і арыгінальнага памеру. Цэгла ў той час была значна боль-



***Фердынанд Рушчыц і Людамір Слядзінскі, перад ганкам дома Рушчыца, каля 1928 г.***

шай, чым у позні і цяперашні час.

Работы ў Троках і на руінах іншых замкаў у часы маёй кансервацыйнай працы ў Вільні і Наваградку грунтаваліся на гэтых жа прынцыпах кансервацыі, а не рэканструкцыі. Але мае наступнікі пайшлі далей, чым я. І Ксаверый Півоцкі ў 1936-1937 гг. і Вітольд Кяшкоўскі ў 1938 і 1939 гг., рэканструюючы часткі замка, імкнуліся да яго поўнай адбудовы. Пасля вайны, у 1951 г. у Троцкім замку аднавілі працу летувіскія кансерватары. Зараз гэта была ўжо поўная рэканструкцыя замка, якая працягвалася да 1956 г. У замку размясціўся гістарычны музей. Замак у Троках мае асаблівае значэнне для летувісаў, бо звязаны з памяццю пра Кейстута і вялікага князя Вітаўта, які тут памёр.

Пасля кансультацыі з прафесарам Клосам я даручыў кіраўніцтва працамі ў Троках архітэктару Яну Бароўскаму[13], асістэнту, а потым і дацэнту кафедры архітэктуры прафесара Людвіка Сакалоўскага на факультэце прыгожага мастацтва ўніверсітэта. Гэта быў вельмі добры крок, бо сваю задачу Бароўскі выканаў бездакорна і, можна сказаць - ён палюбіў Трокі. З юнацтва ён цікавіўся гістары-чнай архітэктурай. Цікава, што яго дыпломны праект 1917 г. ў акадэміка архітэктуры Г. Грыма ў Пецярбургу быў праектам ратушы ў стылі польскага рэнесансу. У Вільні, дзе Бароўскі пасяліўся ў 1924 г., яшчэ да 1929 г. ён правёў кансервацыю касцёла св. Казіміра і пабернардынскіх муроў, упрыгожыў інтэр'ер Вострабрамскай капліцы (у сувязі з кансервацыяй цудатворнага абраза ў 1927 г.[14] кансервавалі і касцёл св. Тарэзы) - такім чынам, ён ужо меў вопыт у галіне аховы помнікаў. У 1945 г. Бароўскі прызначаны першым польскім кансерватарам Гданьска і ваяводства. Дзякуючы яго энергіі і прадбачлівасці тут былі адбудаваны Марыянскі касцёл, Галоўная ратуша і г.д.

Сямейная пара Ян і Халіна Бароўскія былі самымі тыповымі "віленцамі" ў лепшым сэнсе гэтага слова. Асабліва Халіна, якая гаварыла з такім віленскім акцэнтам, што можна было пазнаць яе за кіламетр.

5 ліпеня 1929 г. віленская прэса пісала: *"А 4-й гадзіне дня ў Вільню прыбыў дырэктар Дэпартамента мастацтва Міністэрства Веравызнанняў і асветы Войцех Ястжэмбоўскі. Дырэктар Ястжэмбоўскі, зрабіўшы некалькі візітаў да мясцовых уладаў, агледзеў Школу мастацтваў і рамёстваў Віленскага таварыства выяўленчых мастакоў у суправаджэнні кансерватара доктара Лорэнца, наведаў выдатныя помнікі горада Вільні а потым накіраваўся у Трокі, дзе агледзеў сцены замка і азнаёміўся з распачатымі работамі па ўмацаванні руін".*

Візіт Ястжэмбоўскага стаў магчымасцю ўмацаваць мае адносіны з заснаваным у 1920 г. віленскім Таварыствам выяўленчага мастацтва на чале з Людамірам Сляндзінскім[15]. Для мяне гэта было вельмі важна, бо Таварыства гуртавала вельмі актыўных мастакоў сярэдняга пакалення і было жывым мастацкім і культурным цэнтрам, які пачынаў адыгрываць усё большую ролю ў культурным жыцці Вільні, канкуруючы з факультэтам прыгожых мастацтваў універсітэта. У 1930-я гг. працаваць на факультэт былі запрошаны найбольш выбітныя члены Таварыства Ямант, Несялоўскі, Хопен, Кваткоўскі.

Таварыства налічвала каля 25 членаў і праіснавала да 1939 г. Ядро арганізацыі, акрамя прэзідэнта Людаміра Сляндзінскага, складалі Браніслаў Ямант[16], Ежы Хопен,

[13] Ян Бароўскі (1890-1966), гісторык мастацтва, рэстаўратар помнікаў архітэктуры, займаўся дакументаваннем, кансервацыяй і рэстаўрацыяй помнікаў культуры Віленскага і Навагрadскага ваяводстваў. Архітэктар Радуньскага касцёла. - *Л. Л.*

[14] Абраз Маці Божай Вострабрамскай памерам 163 х 200 см верагодна быў намаляваны ў XVI ст. Дэталёвае даследаванне і кансервацыя абраза былі праведзены Янам Руткоўскім у 1927 г. перад яе каранацыяй. Па тэхніцы, грунтоўцы і саставу фарбаў вызначана, што абраз верагодна створана ў другой палове XVI ст. італьянскім мастаком. - *Л. Л.*

[15] Сляндзінскі Людамір (1889, Вільня - 1980, Кракаў) - мастак-манументаліст. - *Л. Л.*

[16] Браніслаў Ямант (1886, в. Дакудава пад Лідай - 1957, Торунь) - мастак, педагог. Доктар мастацтвазнаўства (1953 г.).




Казімір Квяткоўскі, Міхал Роўба, Казіміра Адамская-Рубіна, Эдвард Карней і Артур Мядзыблоцкі. У першыя гады ў працы Таварыства актыўны ўдзел прымалі архітэктары Станіслаў Вазніцкі, Тэадор Буршэ і Павел Вендзягольскі. Вазніцкі, як і Сляндзінскі, з'яўляўся выпускніком Акадэміі мастацтваў у Пецярбургу. Ён быў ініцыятарам штомесячніка "Апоўдні", прысвечанага мастацтву і мастацкай крытыцы, часопіс спачатку выходзіў у Вільні, а потым, да 1924 г., у Варшаве. Я кажу гэта, каб паказаць, што амбіцыі Таварыства выходзілі і за межы Вільні. У пазнейшыя гады вельмі чынным быў архітэктар Стэфан Нарэбскі.

У памятнай кнізе Таварыства, выдадзенай у 1930 г. да 10-годдзя заснавання, яно характарызавалася наступным чынам: *"Таварыства аб'ядноўвае жывапісцаў і скульптараў розных мастацкіх накірункаў, але ў яго лоне ўтварылася асобная група з пэўным накірункам і мастацкімі мэтамі - група, названая прафесійнымі крытыкамі, Віленскай школай"*. Гэтая Віленская школа бярэ пачатак з творчасці Сляндзінскага. Сярод членаў школы былі Хопен[17], Квяткоўскі, Карней, Пілецкі, Дамброўская і некаторыя іншыя. Уласны творчы шлях мелі Тыман Нясялоўскі[18], а таксама Ямант і Роўба.

Людамір Сляндзінскі, выпускнік Акадэміі мастацтваў у Пецярбургу, вучань ураджэнца Вільні Дзімітра Кардоўскага, вільнянін "па крыві і костцы", з'яўляўся трэцім жывапісцам і другім піяністам у сям'і. Яго дзед Аляксандр быў вучнем Рустэма, бацька Вінцэнты вучыўся ў Школе прыгожых мастацтваў у Маскве, а перад ад'ездам з Вільні ў Маскву ў 1856 г. браў урокі музыкі ў Манюшкі. Ён хацеў выхаваць свайго сына Людаміра музыкантам, адсюль і яго музычныя здольнасці. І дзед, і бацька Людаміра займаліся пераважна партрэтным жывапісам. За ўдзел паўстанні 1863 г. Вінцэнт Сляндзінскі быў асуджаны на пасяленне ў Княгінін Ніжагародскай губерні. Адзін з яго партрэтаў гэтага перыяду я нечакана знайшоў у Ленінградзе, калі быў там прыкладна ў 1970 г. Мой сябар, выдатны археолаг і дырэктар Эрмітажа Барыс Пятроўскі, запрасіў мяне да сябе на абед. Седзячы за сталом і аглядаючы пакой, я ўбачыў маленькі жаночы партрэт.

- Ведаеш, Барыс, я бачу, што гэты партрэт мае выразны віленскі характар.

Барыс падняўся, зняў партрэт са сцяны, павярнуў яго і паказаў мне надпіс - гэты партрэт яго бабулі Фаўстыны Сушчынскай, намаляваны Вінцэнтам Сляндзінскім у 1865 г. у Княгініне. І дадаў:

- Мой прадзед быў палякам, афіцэрам польскага войска, якога за ўдзел у паўстанні 1830-1831 гг. выслалі на Каўказ, і там ён ажаніўся з рускай жанчынай. Бацька быў генералам, брат рыхтаваўся да дыпламатычнай кар'еры, я адзіны ў сям'і "не выйшаў у людзі", бо захапляўся навукай, асабліва археалогіяй. І вось так атрымалася, што адказную пасаду атрымаў адзін я.

Са старымі віленскімі традыцыямі Людамір Сляндзінскі быў звязаны не толькі праз бацьку і дзеда. Яго маці ў першым шлюбе была за Юзафам Чаховічам, вядомым фатографам Вільні XIX ст. Калі пасля яго смерці ў 1888 г. яна выйшла замуж за Вінцэнта Сляндзінскага, дык перадала яму фатаграфічную майстэрню разам з 200 пласцінамі з маляўнічымі фотаздымкамі Вільні, яе архітэктурных помнікаў, гарадскога краявіду і прыгожага віленскага барока. Менавіта з фотаздымкаў Чаховіча кнігарня Элізы Ажэшкі выдавала серыі альбомаў, а пазней маці Людаміра выдавала фотаадбіткі і альбомы. Так што Вільня, яе традыцыі, яе мастацкае мінулае жылі ў яго ў крыві.

Мае стасункі са Сляндзінскім ад пачатку былі вельмі добрымі, і нашы сем'і сябравалі з таго часу, як мы ў 1931 г. знялі кватэру на вул. Вількамірскай, насупраць касцёла св. Рафала, а Сляндзінскія ў той час жылі ў Снípішках, зусім побач з намі на вул. Кальварыйскай (яна была на другім беразе Віліі, адразу за Зялёным мостам). Уражвала кватэра Сляндзінскіх з вялікай гасцёўняй, карцінамі, з вялікім піяніна.

Мы таксама хутка пасябравалі з Хопенам, Квяткоўскім і Нарэбскім. Збліжала нас тое, што ўсе трое былі сапраўднымі аматарамі гістарычных помнікаў і Вільні. У Хопена выразам гэтага, між іншым, былі тры прыгожыя партфоліа (18 афортаў) з відамі Вільні. Усе трое таксама займаліся кансервацыяй помнікаў, хоць спецыяльнай кансервацыйнай падрыхтоўкі не мелі. У Школе мастацкіх рамёстваў, дырэктарам якой на працягу некалькіх гадоў быў Хопен, у пасляваенныя гады вучыліся выдатныя кансерватары - Вільгельм Кукліс і Леанард Торвірт. Ежы Хопен быў выбітным графікам, мастаком высокай культуры. Будучы дацэнтам на факультэце прыгожых мастацтваў у Вільні, ён выхаваў групу добрых графікаў, а потым працаваў прафесарам графікі ў Торуньскім універсітэце.

Казімір Квяткоўскі быў партрэтыстам. У мяне ёсць цэлая сямейная галерэя яго партрэтаў, пачынаючы з лепшага партрэта Ірэны, які выстаўляўся ў 1933 г. у Інстытуце прапаганды мастацтва ў Варшаве.

*(Працяг у наступным нумары.)*

[17] Ежы Хопен (1891, Коўна - 1969, Торунь) -жывапісец, графік, гісторык мастацтва, педагог, рэстаўратар. З 1925 г. працаваў выкладчыкам у Віленскім таварыстве мастакоў, з 1931 г. дацэнт Віленскага ўніверсітэта імя Стэфана Баторыя, загадваў кафедрай графікі. - *Л. Л.*

[18] Тыман Несялоўскі (1882, Львоў -1965 , Торунь ) - жывапісец, графік, педагог. Займаўся таксама прыкладным мастацтвам. З 1926 г. жыў у Вільні, дзе да 1932 г. працаваў выкладчыкам Школы мастацкіх рамёстваў, з 1937 г. - дацэнт кафедры манументальнага жывапісу факультэта выяўленчага мастацтва Віленскага ўніверсітэта імя Стэфана Баторыя. -*Л. Л.*

[19] Казімір Квяткоўскі (1893, Беласток - 1964, Варшава ) - жывапісец і педагог. - *Л. Л.*



№ 39 (91) 27 ВЕРАСНЯ 2023 г.
наша СЛОВА.pdf

*Станіслаў Лорэнц*

# Віленскі альбом

## *(Вільня, творчая інтэлігенцыя, краёўцы)*

*(Заканчэнне. Пачатак у папярэдніх нумарах.)*

Пазней, пасля Варшаўскага паўстання ў 1944 г., ён зрабіў для нас серыю партрэтаў. Пасля вайны ў Нацыянальным музеі Варшавы ён спецыялізаваўся на кансервацыі жывапісу. Жонка Казіміра Квяткоўскага кіравала балетнай школай. Яе юная вучаніца Міка (дзявочага прозвішча і поўнага імя не памятаю) вельмі спадабалася Казіміру. Урэшце Казімір развёўся і ажаніўся з Мікай. Калі мы прыехалі ў Вільню, яны ўжо былі разам. Міка была сімпатычнай, вельмі стройнай, жвавай, вясёлай і мела вялікі поспех, аб чым сведчыць выпадак з Дунікоўскім. Менавіта ў 1931 г. пяць скульптараў былі запрошаны прыняць удзел у конкурсе на помнік Міцкевічу. Аднойчы ў нядзелю мы сядзелі з вялікай кампаніяй сяброў у цукерні Рудніцкага на рагу вул. Міцкевіча і Кафедральнай плошчы. У цукерню са смехам ўварвалася Міка і сказала: "Уявіце, што са мной здарылася сёння раніцай. Пайшла у краму па булачкі і малако, а тут на вуліцы нейкі стары вырадак, маленькі, непрыгожы, назойлівы і з агіднай усмешкай, робіць мне бурныя прапановы. Я ледзь ад яго адчапілася". У гэты момант адчыняюцца дзверы, і ўваходзіць скульптар Дунікоўскі. Міка ўсклікае: "О, гэта той!".

У цукерні Рудніцкага мы амаль кожны дзень сустракаліся з Хопенам, Мікай і Казімірам Квяткоўскімі, Ямантам (старым халасцяком) і многімі іншымі сябрамі. Па вечарах часта хадзілі ў рэстаран гатэля "Брыстоль", дзе было значна танней, чым у Георга. Часам хадзілі і ў "Зацішша" па вуліцы Міцкевіча, "У Мацея" ці ў "Букет".

Адным з нашых блізкіх сяброў быў пейзажыст Браніслаў Ямант, які доўгі час маляваў Вільню, віленскія вуліцы і архітэктуру, пакуль не трапіў ва ўніверсітэт, а потым не стаў чыноўнікам Віленскага староства. Гэта не было непрыемным для мастака, бо тагачасны стараста Ішора быў вельмі культурным і добразычлівым чалавекам. У цукерні маўклівы і сардэчны Ямант заўсёды маляваў на папяроснай паперы, якую мы, вядома, бралі з сабой. Ён любіў маляваць і асабліва карыкатуры, Стэфана Нарэмбскага цікавіла не толькі гістарычная архітэктура і архітэктурная творчасць, але і віленскае мэблярства першай паловы XIX ст. Яго дачка, графік Бася Нарэмбска-Дэмбска-Казлоўская, пасля вайны была вельмі актыўнай у Торуні.

Такім чынам, гэта было асяроддзе віленскіх мастакоў, з якімі, як і з выкладчыкамі ўніверсітэта, я вельмі блізка пасябраваў падчас майго побыту ў Вільні. Афіцыйным актам гэтага сяброўства стала адкрыццё юбілейнай выставы Віленскага таварыства выяўленчых мастацтваў, пра што паведамляў віленскі друк: *"Учора* [1 чэрвеня 1930 г.] *а 1-й гадзіне дня ў патышкевіцкім палацы (на рагу Арсенальскай і Зыгмунтоўскай над Віліяй) адбылося ўрачыстае адкрыццё юбілейнай выставы Віленскага таварыства выяўленчых мастацтваў, якому сёлета спаўняецца 10 гадоў. Выставу адкрыў прэзідэнт таварыства Людамір Сляндзінскі, які пасля кароткай прамовы падарыў спадару Рачкевічу цудоўную тэчку з арыгінальнымі эскізамі членаў Таварыства".*

Ужо ў першыя месяцы майго побыту ў Вільні завязаліся ад пачатку добрыя і сяброўскія, вельмі блізкія і асабістыя стасункі з двума выдатнымі прадстаўнікамі "краёўцаў", выхадцамі з абшараў былога Вялікага Княства Літоўскага, цесна звязанымі з гэтай зямлёй, якія падкрэслівалі асобнасць літоўскіх зямель у складзе Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў.

Казімір Акуліч, дэпутат Сойму, рэдактар "Газеты Краёвай", а потым "Кур'ера Віленскага", юрыст, які вучыўся у Дэрпце і быў членам студэнцкай карпарацыі "Арконія", з'яўляўся вельмі ўраўнаважаным чалавекам. Ён дапамагаў мне ў маёй працы і заўсёды для мяне былі адкрыты старонкі яго газеты. На Акуліча ўвесь час люта нападала "Слова" Станіслава Мацкевіча. Падчас вайны рэдактар "Слова" апынуўся ў Лондане і пасля вайны быў міністрам аднаго з эміграцыйных урадаў. Я спаткаў яго каля 1970 г. у Лондане падчас майго побыту ў клубе "Белы Арол". Да мяне прыйшоў тады мой добры сябар дзяцінства Тытус Камарніцкі, і мы з ім размаўлялі да поўначы. У размове згадалася імя Мацкевіча, і Казімір сказаў мне: "Ведаеш, мы тут у эміграцыі памірыліся, ён мне нават спадабаўся, мы абодва з Вільні".

Другім "краёўцам", якога я сустрэў у той час, быў Людвік Хаміньскі. Ён таксама належаў да маладой генерацыі. Старэйшыя "краёўцы" - гэта найперш галоўны віленскі масон, адвакат Вітольд Абрамовіч, які потым стаў сенатарам, потым быў вывезены на ўсход, і пра яго больш нічога не вядома. Важную ролю сярод іх адыгрывалі адвакат Браніслаў Кжыжаноўскі і Ян Пілсудскі, сярод тых, хто спачуваў, былі Станіслаў Лапацінскі, Аляксандр Мяйштовіч, Аляк-

pawet.net





сандр Лядніцкі, Аляксандр Хаміньскі (бацька Людвіка). З малодшых, акрамя Акуліча - прафесар Вітольд Станевіч, Мар'ян Касцялкоўскі які потым стаў міністрам сельскагаспадарчых рэформаў. Доўгі час ідэйным апекуном гэтай групы быў Юзаф Пілсудскі і побач з ім - Аляксандр Прыстар.

Прафесар Зыгмунт Юндзіл, таксама "краёвец", у сваіх успамінах, апублікаваных у лонданскай "Alma Mater Vilnensis", піша пра маладзейшых: *"Сярод іх я бачу Людвіка Хаміньскага, гарачага, амбітнага, тады яшчэ маладога чалавека тыпу "выбітнага палітычнага дзеяча", які па-сапраўднаму адчуваў шырокія народныя масы. Ён не шкадаваў сіл і працы, значную частку сваёй фартуны аддаваў выдавецкай працы, спрыяў развіццю польскай кнігі ў краі, друкаваў нелегальныя выданні, пракламацыі, бюлетэні і іншае. Шмат пісаў у дэмакратычных часопісах, урэшце, пасля Людвіка Абрамовіча, стаў рэдактарам "Газеты Краёвай"*. Калі ўвесну 1929 г. я пазнаёміўся з ім, Людвік Хаміньскі быў паслом у Сойм, членам партыі "Вызваленне", сябрам Станіслава Тугута. Меў двух сяброў, буйных абшарнікаў, прыхільнікаў зямельнай рэформы без кампенсацыі. Крыштаф Радзівіл, мой універсітэцкі сябар, калі я яму сказаў: "Дык пачні сам з падзелу маёнткаў паміж сялянамі", - адказаў: "Гэта было б глупствам. Усе маёнткі трэба падзяліць".

Так думаў і Люк (так мы звалі Людвіка Хаміньскага). Адразу пасля знаёмства ён грунтоўна пазнаёміў мяне з палітычнай канцэпцыяй "краёўцаў" і шмат размаўляў са мной на палітычныя і культурныя тэмы. Сваю друкарню ў Вільні ёг назваў "Люкс". Гэта была вельмі неабходная ў той час установа, тым больш, што шэраг выданняў, як, напрыклад, зборнікі вершаў віленскіх паэтаў, ён выдаваў за свой кошт.

Маю перад сабой "Горад пад аблокамі" (Вільня) Вітольда Гулевіча, на кнізе пазначана: "Выдаў і надрукаваў Людвік Хаміньскі, 1931". Вокладка Міхала Роўбы. Кніга аздоблена рэпрадукцыямі 14 графічных прац віленскіх мастакоў. Надрукавана было 700 стандартных асобнікаў і 25 асобнікаў на паперы ручной працы, кожны экзэмпляр з сваім нумарам, кшталту A-E-II-XX, з подпісам аўтара, выдаўца і мастакоўграфікаў. Надрукавана шрыфтам друкарні "Люкс" у Вільні, якая знаходзілася па адрасе вул. Партовая, 7.

Не памятаю ўжо ў якім годзе, Люк расказваў мне, што купка "краёўцаў" і іх сяброў стварыла неафіцыйны і незарэгістраваны клуб "Шумераў" ("Sumeryjczykow"), якія віталі адзін аднаго словамі "Sum, sum, sum"[20]. Збіраліся яны ў Бібліятэцы Урублеўскага, былым палацы Тышкевічаў. Ён паведаміў мне, што я таксама прыняты ў вільняне і магу лічыць сябе членам клуба "шумераў".

Друкарня "Люкс" імкнулася ўвесці ў Вільні сучасную эстэтыку друку і кнігі, сярод яе выданняў была і кніга Людвіка Абрамовіча "Чатыры стагоддзі віленскага кнігадрукавання 1525-1925 гг.", у "Люксе" друкаваліся творы Чэслава Янкоўскага, Гелены Ромер-Ачанкоўскай, Ванды Недзялкоўскай-Дабачэўскай, Людвіка Яноўскага, Вацлава Студніцкага, Тадэвуша Лапалеўскага, Яўгеніі Кабылінскай-Масееўскай і нават Станіслава Пшыбышэўскага, Эдварда Слоньскага і Бенедыкта Герца.

Працяглае мецэнацтва дорага каштавала Хаміньскаму (друкарня "Люкс", заснаваная ў 1918 г.). Таксама і яго маёнтак Ольшаў[21] не прыносіў прыбытку. Ён паставіў у Ольшаве вялікія сажалкі, але зрабіў гэта няўмела, і ўсіх малькоў з'елі шчупакі. А для гэтай справы Лук узяў у банку вялікі крэдыт.

Сам Ольшаў быў прыгожым палацавым цэнтрам, сядзібай вельмі культурных, са старымі традыцыямі абшарнікаў. З канца XVII ст. сядзіба знаходзілася ва ўласнасці роду Хаміньскіх. У пачатку XVIII ст. належала Людвіку Якубу Хаміньскаму герба Ліс, сыну Канстанціна Яна і Канстанцыі з Верашчакаў. Людвік быў старастам ашмянскім і пісарам вялікага літоўскага князя. Францішак Ксаверый Хаміньскі з'яўляўся апошнім ваяводам мсціслаўскім. Дзед Люка, Станіслаў, пасля заканчэння Віленскага ўніверсітэта ў 1824 г. паступіў у гвардзейскі Паўлаўскі полк. Даслужыўся да звання генерала. Быў губернатарам горада Коўна. Як уладальнік Ольшава, ён тройчы выбіраўся маршалкам шляхты Свянцянскага павета. Яго партрэт у капітанскай форме каля 1825 г. напісаў у Пецярбургу Валенты Ванькові́ч. Гэты партрэт вісеў у Ольшаве ў сталовай сярод іншых фамільных партрэтаў. Пасля вайны быў перавезены ў Варшаву, і я купіў яго для Нацыянальнага музея. Цяпер ён знаходзіцца ў партрэтнай галерэі ў Вілянове.

Выдатным грамадскім дзеячам быў Аляксандр Хаміньскі, тата Люка, сын Станіслава і Эвеліны з Шчытаў. Быў дэпутатам Думы, дзе прадстаўляў кансерватыўны накірунак, затым членам Дзяржаўнай рады. У 1905 г. разам з сваёй жонкай Ядвігай з Горватаў заклаў у Ольшаве пачатковую школу для беларускіх дзяцей, у якой выкладанне рэлігіі вялося на польскай мове. Разам з прафесарам Пташыцкім выдаў так званы "Ольшаўскі кодэкс Хаміньскіх з XVI ст.", які захоўваўся ў фамільным архіве ў Ольшаве. Усебакова адукаваны чалавек, ён жыва цікавіўся культурнымі і грамадскімі справамі. Трэба дадаць, што ў Ольшаве мелася добрая бібліятэка ў некалькі тысяч тамоў.

Драўляны палац у Ольшаве датуецца другой

[20] Sum - лац. - Я; Sumeryjczyk - жыхар Шумера. - *Л. Л.*

[21] Маёнтак знаходзіўся каля дарогі з Свенцян да Ашмянаў і Вілейкі. - *Л. Л.*





паловай XVIII ст. Аднапавярховы, з ламаным дахам, з двухпавярховым калонным порцікам, пабудаваны цеслярамі ў выглядзе падковы ў "нямецкіх" традыцыя (ці не івянецкіх?). Мураваныя крылы да палаца ў 1893 г. дарабіў архітэктар Тадэвуш Раствароўскі. У гэтых прыбудовах размяшчаліся гасцявыя пакоі, якія пры адсутнасці грошай у гаспадароў, можна было здаваць на лета для адпачынку. Сядзібны дом стаяў на ўзгорку над маляўнічым берагам ракі Страча. Вялікі парк на схілах ператварыўся ў сажалкі і лясы, пераважна хвойныя, дзе сярод пагоркаў ляжала шэсць азёр. Самае буйное з іх, Глубель, мела плошчу 55 га.

Для тых, хто адпачывае, у Ольшаве стваралася прыемная, прыязная і сямейная атмасфера. Я змог трапіць у Ольшаў толькі аднойчы ў ліпені. Тады мне расказалі, што па ініцыятыве пана Аляксандра для адпачываючых быў арганізаваны паказ жаночай моды апошняй чвэрці XIX ст., а можа і больш ранняй. У Ольшаве да таго часу захоўвалася калекцыя прыгожых сукенак. Аляксандр сказаў мне, што гэты вечар быў для яго вельмі важным.

Мая першая сустрэча з віленскімі пісьменнікамі адбылася 21 сакавіка 1929 г. на вечарыне віленскай паэзіі, якая адбывалася ў зале гімназіі імя Адама Міцкевіча.

Неўзабаве мы з жонкай Ірэнай былі на Літаратурнай серадзе, дзе абмяркоўвалася пытанне здабыцця для Звязу пісьменнікаў у Вільні так званай "Келлі Конрада" ў па-базыльянскіх мурах. Шматлікія намаганні грамадства па вяртанню з рук праваслаўнага духавенства гэтай "нацыянальнай святыні" рабіліся на працягу шэрагу гадоў. Шмат гадоў ішла безвыніковая цяжба аб правах уласнасці паміж праваслаўнай кансісторыяй і дзяржавай, якая вырашылася на карысць дзяржавы толькі ў 1927 г. Карыстальнікамі былога манастырскага будынка дзяржаўныя ўлады пакінулі праваслаўную семінарыю, Беларускую гімназію, Беларускае навуковае таварыства і Беларускі музей імя Яна Луцкевіча. Арандатары былі выдалены толькі з паўднёвай часткі першага паверха, дзе размяшчалася турма філарэтаў. Але не было прынята рашэння, што там павінна знаходзіцца, і частка будынка стаяла не адрамантаваная і пустая. Старшыня Віленскага Звязу пісьменнікаў прафесар Пігонь на згаданай Літаратурнай серадзе звярнуўся да мяне з просьбай перадаць памяшканне з "Келляй Конрада" пад сядзібу Звязу. Я адразу вельмі энергічна ўзяўся за справу, дамогся рашэнне ваяводы і пазыку на рамонт памяшканняў. Абнаўленне павінна было быць грунтоўным, бо ў 1867 г. расейцы перабудавалі ўсе будынкі скасаванага манастыра, для стварэння вялікіх памяшканняў знялі папяровыя сцены келляў і зруйнавалі скляпенні камеры і калідоры, якія захаваліся толькі часткова. Справа "Келлі Конрада", месцазнаходжанне якой было пад пытаннем з-за рэканструкцыі, тлумачаць даследаванне прафесара Юліюша Клоса ў 1921-1923 гг.[22]

Віленскія пісьменнікі атрымалі месца, памятнае не толькі з-за суда над філарэтамі. Увайсці на гэтую тэрыторыю можна было праз прыгожую браму ў стылі ракако (па адрасе вул. Вострабрамская, 9). Далей, пасярод вялікага двара стаяла праваслаўная царква св. Тройцы, заснаваны князем Канстанцінам Астрожскім у 1514 г. у гонар перамогі пад Оршай. Пасля пажару 1748 г. царкву перабудавалі, дадалі да яе дзве лёгкія вежы і пабудавалі вышэйзгаданую шыкоўную манастырскую браму, а таксама пабудавалі абодва крылы кляштара, якія існуюць і сёння - архітэктар Ян Крыштаф Глаўбіц. Падчас майго знаходжання ў Вільні мне ўдалося ўстанавіць, што гэты амаль невядомы раней архітэктар быў сапраўдным стваральнікам найвялікшых твораў барока і ракако ў Вільні і ваколіцах. Спраектаваў касцёл св. Кацярыны ў Вільні, перабудаваў інтэр'еры і аформіў цудоўныя алтары ў касцёле св. Яна, пабудаваў касцёл і кляштар у Беразвеччы, перабудаваў касцёл св. Зоф'і ў Полацку і інш. Гэта было маё вялікае адкрыццё, заснаванае на знойдзеных архівах. Ужо ў Варшаве, у 1937 г., у выдавецтве Варшаўскага навуковага таварыства я апублікаваў дысертацыю, прысвечаную Глаўбіцу[23].

На першы паверх сядзібы Звязу пісьменнікаў трэба было ўваходзіць па шырокім калідоры, які цягнуўся па ўсёй даўжыні памяшкання. Адразу ад калідора направа была вялікая зала для пасяджэнняў з трыма вокнамі і невялікім подыюмам ля дальняй сцяны злева. Далей з калідора дзверы вялі ў вялікую двухаконную "Келлю Конрада", у якой працавала чытальня. У сцяне была ўмаравана таблічка з надпісам "Hic natus est..." Тут размяшчаўся сакратарыят Звязу, а пазней Віленскага аддзела Польскага турыстычнага таварыства.

Пасля ад'езду ў 1930 г. прафесара Пігоня з Вільні старшынём Звязу пісьменнікаў стаў Вітольд Гулевіч. Мы з Ірэнай па магчымасці хадзілі на ўсе літаратурныя серады. Але я ўжо мала што з іх памятаю.

У Гародні існавала вельмі актыўнае Таварыства сяброў літаратуры і мастацтва, у дзейнасці якога прымала ўдзел жонка прэзідэнта горада Маўрыцыя О'Браена дэ Ласі, уладальніка маёнтка Аўгустовак пад Гродна. На пасадзе прэзідэнта О'Браэн дэ Ласі быў ініцыятыўным, цікавіўся рэканструкцыяй Каралеўскага замка, будаўніцтвам бульвараў на Нёмане, імкнуўся падтрымліваць

[22] Пра "келлю Конрада" пісалі: Ant. Luckiewicz. Prawda o "celi Konrada". W setne rocznice procesu Filomatow. Wilno, 1923.; Antoni Luckiewocz. Z powodu sporu o "Cele Konrada" // Preglad Wilenski. 1924, № 6. S. 5-7.: Erka [Ул. Талочка]. Prawda o celi Konrada // Preglad Wilenski. 1924, № 2. S. 4-5. (Пераклад гэтых артыкулаў Луцкевіча і Талочкі, гл: Спрэчкі пра "Келью Конрада" ў па-базыльянскіх мурах Вільні // Наша слова. № 48 (1563), 2 снежня 2021.) - *Л.Л.*

[23] Stanislaw Lorentz. Jan Krzysztof Glaubitz architekt wilenski XVIII w. : materialy do biografii i tworczosci. Warszawa, 1937.

актыўнае культурнае жыццё. Яго жонка Надзея з рускіх князёў Друцкіх сама была пісьменніцай. У яе меліся блізкія адносіны з Зоф'яй Налкоўскай[24], якая жыла ў Гродна разам з сваім мужам Юрам-Гажэхоўскім. Друцкая ганарылася тым, што ў 1930 г. Налкоўская ўвяла яе ў ПЭН-клуб. Вітольд Гулевіч быў у блізкіх стасунках з мужам і жонкай О'Браен дэ Ласі і наведваў іх у Аўгустоўку. Я добра ведаў захавальніка Гродзенскага музея ў замку Юзафа Ядкоўскага. Гарадзенскае таварыства прывозіла з Варшавы вядомых лектараў і падтрымлівала сувязь з Вільняй.

У сваім выступе ў Літаратурнай серадзе я прадставіў праблему выратавання руін сярэднявечных замкаў і абмеркаваў распачатыя работы ў Троках, Крэве, стан руін у Каралеўскіх Медніках, работы на замку ў Навагрудку і рэканструкцыю замка ў Міры, а таксама праекты, звязаныя з руінамі на Замкавай гары ў Вільні. У дыскусіі пасля майго выступу прынялі ўдзел Людамір Сляндзінскі, Хэлена Ромер-Ачанкоўска, Ежы Хопен, Станіслаў Яроцкі і праф. Рыдзеўскі. Маю інфармацыю ўспрынялі з поўнай ухвалой.

Адразу пасля ўступлення на пасаду ў пачатку 1929 г. я атрымаў "ганаровую картку" аб прыёме ў сябры тэатра "Рэдута" [25] на Пагулянцы і ў Польскі Тэатр у будынку "Лютня" на вул. Міцкевіча. Мы вельмі часта хадзілі ў абодва тэатры, асабліва на Пагулянку. Францішак Рыхлоўскі, які кіраваў Польскім тэатрам з 1920 г., адзначыў у лютым 1928 г. дваццаць пяць гадоў тэатральнай працы. У камісію па святкаванні гэтага юбілею пад патранатам ваяводы Рачкевіча ўвайшлі, між іншым: Фердынанд Рушчыц, Юліюш Остэрва, Чэслаў Янкоўскі, мэр горада Юзэф Фалееўскі, Хелена Ромер-Ачанкоўская, Ежы Рэмер. Людвік Сольскі напісаў уступ да памятнай кнігі "Юбілейны вянок Францішка Рыхлоўскага". Тэатр Рыхлоўскага можна было назваць народным тэатрам бо яго праграмная дзейнасць мела камерцыйны характар.

У сярэдзіне 1929 г. на Пагулянцы адбыліся прынцыповыя змены ў сувязі з вяртаннем "Рэдуты" ў Варшаву. Дырэктарам тэатра стаў Аляксандр Зельвяровіч.

А. Зельвяровіч абапіраўся на маладых - пасля каманды маладых рэдутаўцаў, была каманда з лепшых маладых выпускнікоў Варшаўскай тэатральнай школы. Ён падабраў каманду вельмі добрых маладых акцёраў з такімі зоркамі, як Ірэна Эйхлераўна і Мар'ян Выжыкоўскі, Цяцэрскі і Малынічаўна. А паколькі ён запрашаў на гасцявыя выступленні і вядомых артыстаў, узровень тэатральных пастановак быў вельмі высокі.

18 лістапада 1929 г., як паведамляў "Кур'ер Віленскі", *"па ініцыятыве бурмістра горада пана Фалееўскага ў Ратушы адбылася нарада, на якой абмяркоўваўся рэпертуар і ранейшая дзейнасць дырэктара Зельвяровіча (віца-бурм. Чыж, праф. Рушчыц, Лорэнц, праф. Эрэнкройц, Г. Ромер-Ачанкоўска і некаторыя іншыя) выслухалі даклад дырэктара Зельвяровіча, які, да шчырага задавальнення аўдыторыі, запэўніў, што, насуперак песімістычным прагнозам, наведвальнасць абодвух тэатраў вельмі добрая* [Зельвяровіч заняў і "Лютню"]".

У верасні 1930 г. з намі адбылася даволі дзіўная прыгода. Была ў нас вельмі добрая маладая служанка Польця, якая паходзіла з вельмі беднай вёскі Браслаўскага павета, амаль на мяжы з Латвіяй. Гэта была яе першая служба ў горадзе. Яна расказала нам пра цяжкае становішча сваёй сям'і, пра тое, як зусім маленькай дзяўчынай ёй давялося выехаць на сезонныя работы ў Латвію, на т. зв. "саксы". Расказвала, як дрэнна ставіліся багатыя латышскія сяляне да бедных рабочых з Польшчы.

Неяк у верасні мы збіраліся на вялікую вечарыну, вярнуцца павінны былі толькі позна ўвечары. У Ірэны было пры сабе больш за тысячу злотых і баючыся згубіць іх, яна вырашыла пакінуць грошы на захаванне ў Польці. Вярнуўшыся дадому, мы адразу леглі спаць. Калі ўсталі раніцай, Польці не было дома, і не было невядома, чаму яна не прыгатавала сняданак, нічога не купіла і чаму кудысьці сышла, нічога не сказаўшы нам. Я пайшоў у кабінет, а Ірэна чакала. Аднак прайшло некалькі гадзін, а Польці ўсё не было. Таму Ірэна, заклапочаная, пайшла ў паліцэйскі ўчастак, дзе праверыла, што Польця не стала ахвярай нейкага здарэння. Паколькі Ірэна настойвала на тым, каб паліцыя пачала шукаць Польцю, у яе спыталі, колькі ёй гадоў. На адказ Ірэны, што яна маладая дзяўчына, сказалі: "Не хвалюйся, абавязкова знойдзецца, з маладымі бывае". Але Ірэна не паддалася, таму ў яе пачалі пытаць пра акалічнасці знікнення. Пасля таго, як Ірэна расказала пра грошы, паліцыянты змянілі сваё меркаванне: "Так, гэта іншае, ёсць падазрэнні ў крадзяжы, і таму мы прымаем вашу заяву". Ірэна запратэставала, яна казала што не падазрае Полцю ў крадзяжы, але паліцыянты аформіла афіцыйны пратакол.

Нечакана за некалькі гадзін да абеду (мяне яшчэ не было дома) з'явілася Польця ў слязах і прызналася Ірэне, што яна ноччу ўцякла з дому, бо з ёй здарылася няшчасце. У той вечар, калі яна гатавала абед, у руцэ яна трымала грошы, і грошы намоклі. Хацела іх высушыць, паклала на бляху на кухні, і якраз Ірэна паклікала яе. Яна пабегла да гаспадыні, а калі вярнулася на кухню, то ўбачыла, што грошы згарэлі. Ноччу, пасля нашага вяртання, з роспачы, яна паляцела ў горад, і як толькі адчынілі сабор (мы жылі побач), яна ўвайшла ў касцёл і

[24] Зоф'я Налкоўская (1884 - 1954) - польская пісьменніца. Скончыла Варшаўскую прыватную гімназію (1901). У 1922-1927 гг. жыла ў Гародні, была куратарам патранату (апекі) вязьняў гарадзенскай турмы, дапамагала зняволеным. Янка Брыль пераклаў на беларускую мову асобныя яе апавяданні. - *Л. Л.*

[25] Рэдута (Reduta) - эксперыментальны тэатр-лабараторыя, існаваў з 1919 па 1939 гг. У 1925 г. тэатр з Варшавы пераехаў у Вільню, размяшчаўся ў тэатры на Пагулянцы, у 1931 г. вярнуўся ў Варшаву. - *Л. Л.*





ўвесь час сядзела там, малілася і плакала, пакуль не вырашыла вярнуцца і расказаць усё. Мы паверылі, што такое няшчасце магло здарыцца з гэтай простай дзяўчынай, і змірыліся з такой сумнай стратай грошай. Да Польці мы па-ранейшаму ставіліся сардэчна.

Праз некаторы час, аднак, прыйшоў выклік з раённага суда: "…Апалоніі Гадзінаўна, якая жыве ў Вільні, вул. Маставая 3 м. 24 з'явіцца ў адпаведнасці з арт. 592 і 834 УПК 18 кастрычніка 1930 г. на 9.00 на пасяджэнне судовай калегіі па крымінальных справах Віленскага акруговага суда для дачы тлумачэнняў па справе абвінавачання яе па арт. 574 КК".

Я адразу пайшоў у суд, каб патлумачыць, што мы зусім не абвінавачваем Польцю і просім адмяніць справу. Але мне растлумачылі, што гэта не мы, а пракурор выстаўляе абвінавачанне на падставе паліцэйскага пратаколу і справу нельга спыніць.

Усхваляваныя мы звярнуліся да нашага сябра Станіслава Вяслаўскага, які быў не толькі музыкам, але і юрыстам, каб ён абараніў Польцю ў судзе. Зразумела, ён ахвотна і самааддана пагадзіўся.

Справа спалення грошай стала вядомай на ўсю Вільню і набыла адценне гумарыстычнай сенсацыі. Вітольд Гулевіч даслаў нам выразку з газеты пад назвай "Вогнетрывалыя банкноты: праф. Шурып з Цюрыху вынайшаў і ўдасканаліў спосаб вырабу непарушных і вогнеўстойлівых банкнот..." з з допісам ад сабе: "Для суцяшэння сужэнцам, якія пакутуюць".

Між тым, за некалькі дзён да суда справа набыла зусім іншы абарот. Польця з адчайным плачам кінулася да Ірэны ў ногі: "Спадарыня, вы так добра да мяне ставіцеся, і я не магу больш так жыць, таму што тыя грошы скрала я. Калі вы далі мне столькі грошай, я не вытрымала. Вось 950 злотых, бо на сяло бацькам я ўжо паслала 50 злотых".

Мы пагадзіліся з Вяслаўскім, што ў судзе трэба будзе раскрываць праўду і абарона павінна быць іншай.

Акруговы суд размяшчаўся ў вялікім будынку на Лукішскай плошчы. Справа праходзіла ў вялікай судовай зале. Я замовіў два таксі. У першай з вул. Маставой у суд ехала Ірэна з Польцяй, у другім - я і мама. Зала суда была поўная. Польцю пасадзілі на лаву падсудных, мы сядзелі ўтрох у першым радзе. Напэўна, не толькі публіка, але і сам суд крыху пацешыўся гэтым выпадкам, бо ў залу прыйшоў нават наш сябар, старшыня суда, а таксама разам з ім некалькі суддзяў, якія афіцыйна ў працэсе не ўдзельнічалі. Вяслаўскі выступіў з прыгожай прамовай. Суд вынес прысуд: некалькі месяцаў ці год з адтэрміноўкай на два гады. І ў гэты момант Польця не па-людску закрычала: "Пані, ратуйце мяне, мяне хочуць павесіць на два гады". А далей усё пайшло зусім нефармальна. Ірэна падбегла да лавы абвінавачаных і трымала Польцю за рукі, Вяслаўскі яе суцяшаў. … Вярталіся на дзвюх брычках. Я падумаў пра Ляльку Пруса. Польця, яшчэ нейкі час засталася з намі. Але потым яна сказала нам, што хоча вярнуцца ў вёску.

У Ірэны былі вялікія абавязкі па гаспадарцы, да таго ж мама часта прыязджала да нас надоўга, па чарзе прыязджалі яе сёстры з Варшавы. У нас заўсёды была адна ці дзве служанкі, якія дапамагалі жонцы, бо мы вялі вельмі ажыўленае грамадскае жыццё. Ірэна з самага пачатку ўзяла на сябе шматлікія грамадскія абавязкі. Спачатку яна ўвайшла ў склад Таварыства "Сем'і чыноўнікаў", потым узначаліла секцыю ўправы гуртка пры Ваяводскім упраўленні, затым стала членам управы "Камітэта летніх антысухотных лагераў для дзяцей", стала членам праўлення "Таварыства заахвочвання народнай творчасці ў Вільні", а таксама ўступіла ў "Працоўны звяз жанчын", дзе асабліва клапацілася пра арганізацыю дзіцячых ясляў на Кальварыйскай, 69. Калі ў 1931 г. быў створаны "Камітэт выратавання Віленскай базылікі", жонка ўвайшла ў склад жаночага гуртка і актыўна арганізавала мерапрыемствы. У жаночыя арганізацыі часам збіралася на кватэры біскупа Міхалкевіча ў вул. Замкавая, 4.

21 студзеня 1931 г. прафсаюз польскіх пісьменнікаў у Вільні і Сіндыкат віленскіх журналістаў арганізавалі 116-ю Літаратурную сераду, прысвечаную творчасці віцапрэзідэнта Звязу пісьменнікаў, вядомай грамадскай дзяячкі і пісьменніцы Гелене Ромер-Ачанкоўскай у гонар 25 гадоў яе літаратурнай і публіцыстычнай працы.

Увосень 1930 г. я пачаў разглядаць магчымасць стварэння ў Вільні Музея сучаснага мастацтва, які б прадстаўляў сучаснае віленскае мастацтва на фоне тагачаснага польскага мастацтва. Мая ініцыятыва сустрэла моцную падтрымку віленскіх мастакоў. Міністэрства веравызнанняў і народнай асветы вітала гэтую ініцыятыву, а дырэктар Дзяржаўных мастацкіх калекцый, др. Альфрэд Лаўтэрбах паабяцаў перадаць у дар нашаму музею частку карцін выдатных сучасных мастакоў, галоўным чынам з Варшавы і Кракава.

На пачатку сакавіка 1931 г. быў створаны арганізацыйны камітэт Музея, у які ўвайшлі выканавец абавязкаў ваяводы Стэфан Кіртыкліс, стараста горада Фалееўскі, Рушчыц, Слюндзінскі, Хопен і я. Было вырашана, што пакуль музей будзе месціцца ў занядбанай вялікай кардэгардыі палаца Рэчы Паспалітай, а пасля рэстаўрацыі пераедзе ў гістарычны будынак былой Віленскай ратушы. Арганізатары жадалі, каб музей: 1) меў пастаянную экспазіцыю з асаблівым акцэнтам на мастакоў з Вільні, 2) арганізоўваў часовыя выставы.

Урачыстае адкрыццё Музея сучаснага мастацтва ў былой кардэгардыі ў двары палаца РП адбылося 7 чэрвеня 1931 г. Аднак, нягледзячы на падтрымку канцэпцыі дырэктарам дэпартамента мастацтваў Міністэрства веравызнанняў і народнай асветы Уладзіславам Скочыласам і перадачы на захоўванне 20 карцін найвыдатнейшых мастакоў таго часу, справа не дайшла да перадачы для музея аднаўленага будынка старой Ратушы. Музей існаваў, але фактычна яго праца замерла, і ён не разгарнуў сур'ёзнай дзейнасці.

***Пераклад і каментары Леаніда Лаўрэша.***




*Станіслаў Лорэнц*

# Віленскі альбом

***(Разліў Віліі і знаходка каралеўскіх магіл - Пошукі магілы Вітаўта - Справа з помнікам Міцкевічу)***

Мы вярнуліся з Італіі ў Вільню адразу пасля падзеі, якая мела незвычайныя вынікі. Рака Вілія разлілася і 26 красавіка 1931 г. затапіла Саборную плошчу. Вада падышла да прыступак фасада катэдры (базылікі) і ўтварыла возера паміж вуглавым будынкам па вуліцы Міцкевіча, дзе месцілася цукерня Рудніцкага і катэдрай. Сабор апынуўся ў небяспецы, але яго стан і раней выклікаў заклапочанасць.

Мы ўсё ведалі пра трывожны стан катэдры і таму пад кіраўніцтвам прафесара Клоса і па ўзгадненні са мной тут вяліся даследаванні. Цяпер, калі падвал сабора затапіла вада, сітуацыя стала небяспечнай і надзвычай трывожнай. Стала відавочна, што патрэбны вялізныя выратавальныя працы і вельмі вялікія выдаткі, прынамсі ў некалькі сотняў тысяч злотых. Па згодзе з ваяводам Бэчкавічам, з аднаго боку, і арцыбіскупам Рамуальдам Ялбжыкоўскім і біскупам Казімірам Міхалкевічам, з другога, мы вырашылі стварыць Агульны камітэт выратавання базылікі. Вось тэкст запрашэння на першае пасяджэнне гэтага камітэта:

**"Ваявода Віленскі і Арцыбіскуп Мітрапаліт Віленскі ласкава запрашаюць**
**прыбыць 17 ліпеня гэтага года** [1931] **у 18-00**
**у Вялікую канферэнц-залу Ваяводскай управы**
**на арганізацыйнае пасяджэнне**
**Камітэта аднаўлення Віленскай базылікі.**

Старшынём Камітэта стаў віленскі біскуп-суфраган кс. Казімір Міхалкевіч, першым віца-старшынём маркграфіня Яніна Умястоўская - вельмі багатая жанчына, між іншым, уладальніца Жамаслаўля, які яна ахвяравала Віленскаму ўніверсітэту. Палац у Жамаслаўлі, пабудаваны ў другой палове XIX ст. з'яўляўся копіяй каралеўскага палаца на востраве ў Лазенках (другая копія XIX ст. Лазенкаўскага палаца знаходзілася на Віленшчыне ў маёнтку Тышкевічаў). Фонд маркграфіні Умястоўскай у Рыме і дагэтуль падтрымлівае навуку і культуру. Умястоўская была пажылым чалавекам і ўжо цяжка рухалася. Калі я аднойчы быў у яе ў Вільні, яна прыняла мяне лежачы ў ложку, відаць, звычайна гэтак яна і прымала гасцей. Маркграфіня была вельмі ўсхвалявана знаходкай каралеўскіх магіл у катэдры і лічыла, што павінна асабіста аддаць сваю даніну павагі каралям[1]. Паколькі гэта для яе было немагчыма па стане здароўя, яна выдала візітоўку адрасаваную: *"Вялебнаму прэлату Савіцкаму і сп. Кансерватару доктару Лорэнцу, цяперашнім захавальнікам каралеўскага праху"*, з наступным зместам: *"Маргрaфіна Умястоўская, Варшава, Алеі Уяздоўскія, 43* [слынны дом, яе маёмасць], *Вільня, Трокская, 19* [яе дом і рэзідэнцыя]. *Ласкава прашу ксяндза-прэлата Савіцкага і доктара Ларэнца аб дазволе спусціцца ў крыпту з Каралеўскім прахам майму адвакату Мацею Яманту, тэл. 10-29, замест мяне".*

Яе жаданне было выканана. Я ўрачыста ўвёў у крыпту паверанага Яманта (родны ці стрыечны брат Браніслава), каб ад імя маркграфіні Умястоўскай ён пакланіўся каралеўскім парэшткам.

Другім віца-старшынём Камітэта стаў прэзідэнт Падатковай палаты Ян Малецкі, скарбнікам - дырэктар банка Юзаф Каралец, які пазней таксама стаў і скарбнікам Камітэта помніка Міцкевічу, сакратаром - пробашч базылікі, кс.-канонік Антоні Ціхонскі, члены прэзідыума: пробашч базылікі кс.-прэлат Адам Савіцкі, дарадца па справах рэлігій ваяводства Віктар Пятровіч, Тадэвуш Лапалеўскі і я як кансерватар. Старшынём тэхнічнага камітэта стаў дырэктар грамадскіх прац ваяводскай управы Аляксандр Зубялевіч, гістарычна-мастацкага камісіі - Фердынанд Рушчыц, фінансавай камісіі - дырэктар Станіслаў Бялас, а пасля яго смерці - кс. Аляксандр Масціцкі. У рэвізійную камісію абраны старшыня Акруговай падліковай палаты Ян Петрашэўскі, кс.-прэлат Францішак Валодзька і прэзідэнт Адольф Копец.

Работамі кіраваў прафесар Юліюш Клос, тэхнічным кіраўніком, які непасрэдна займаўся справамі, ён прызначыў Яна Пекшу (пазней стаў архітэктарам). Даследаванні пачаліся на пачатку жніўня 1931 г. з капліцы св. Казіміра, дзе падчас паводкі абрынулася падлога. Даследаваліся таксама і ўсе вядомыя склепы і падземныя калідоры, і стала вядома, што патрэскаліся гіпсавыя маркеры, якія мы ўстанавілі ў 1930 г., што, несумненна, сведчыла аб далейшым руху падмуркаў. Падчас даследаванняў у капліцы св. Казіміра, пад алтарным прастолам былі знойдзены дзве урны са сплаву волава і свінцу, у якіх знаходзіліся сэрца і вантробы караля Уладзіслава IV, пастаўленыя сюды 28 чэрвеня 1648 г. Цела караля, які

[1] Гл: Лаўрэш Леанід. Знаходка пахавання вялікага князя ВКЛ і караля Аляксандра і вялікіх княгінь і каралеў Лізаветы і Барбары ў 1931 г. // Наша слова.pdf № 28 (80), 12 ліпеня 2023. - *Л. Л.*

pawet.net

№ 40 (92) 4 КАСТРЫЧНІКА 2023 г.
наша СЛОВА.pdf





*Віленская катэдра ў 1847 г., злева - замкавая гара, справа гара Бекеша*



*Урна з парэшткамі Уладзіслава IV, разбітая і падчас рабавання ў 1655 г. і знойдзеная ў верасні 1931 г.*

памёр у Мерачы, было перавезена ў Вавель. Шматлікія дзіркі, прарэзаныя ў слоіках, сведчылі аб тым, што праз сем гадоў пасля смерці караля, падчас нашэсця маскоўскіх войскаў, месца пахавання яго парэшткаў было знойдзена і разрабавана -у слоіках шукалі каштоўнасці.

Тыя, хто вёў работы, неадкладна паведамілі аб знаходцы слоікаў з парэшткамі караля. Працу спынілі, паведамілі мне, кс. Савіцкаму і членам гістарычна-мастацкай камісіі. Калі мы разам сабраліся над дзіркай і загадалі выняць бляшанкі з-пад завалаў, прафесар Марыян Марэлоўскі, які часта паводзіў сябе эксцэнтрычна, раптам закрычаў: "Не, кс.-прэлат павінен асвяціць прылады, з дапамогай якіх будуць вынятыя каралеўскія парэшткі". Вельмі засмучаны ксёндз Савіцкі загадаў прынесці з сакрыстыі святую ваду і крапідла. Увесь гэты далікатны час мы ўрачыста стаялі над адтулінай. Калі кс. Савіцкі скончыў чын асвячэння, рабочыя пачалі ламаць друз вакол слоікаў. Але асвечаныя прылады ім не падышлі, рабочыя кінулі іх, узялі іншыя і вынялі слоікі. Гэтак неасвечаныя ламы і рыдлёўкі дакрануліся да каралеўскіх слоікаў.

У далейшым даследаваліся сутарэнні пад бакавымі сценамі і капліцамі і пад галоўным нефам, доступ да якіх быў немагчымы на працягу больш за сто гадоў, бо ўваходныя праёмы былі засыпаны друзам і замураваны Гуцэвічам[2] падчас перабудовы сабора ў другой палове XVIII ст. Пад галоўным нефам выяўлены шэраг асобных крыптаў, не злучаных адна з адной, у іх ляжала шмат безыменных костак. І прафесар Клос, і я чакалі, што, магчыма, пад галоўным нефам мы знойдзем крыпту з каралеўскімі магіламі.

20 верасня пад нефам каля празбітэрыя, з правага боку нефа, была знойдзена раней невядомая крыпта і расчышчаны ад смецця прыступкі, якія вялі ў гэтую крыпту. З-за позняга часу мы вырашылі разысціся, каб толькі на раніцы прабіць замураваны ўваход у крыпту. 21 верасня, пасля восьмай гадзіны, Пекша прыйшоў да мяне ў вая-водскі мастацкі аддзел (гэта было побач з Катэдрай, якраз на другім баку плошчы) і з таямнічым выразам твару сказаў, што раніцай ён адбіў адну з цаглін у замураваным уваходзе ў склеп, пасвяціў унутр электрычным ліхтары-кам і ўбачыў карону - значыць, гэта склеп з магіламі каралёў. Я загадаў яму неадкладна паведаміць пра гэта прафесару Клосу і пайшоў да ваяводы Бэчкавіча. Ваявода адразу патэлефанаваў у Варшаву. Я пайшоў у катэдру і паслаў па біскупа Міхалкевіча і пралата Савіцкага. Яны вельмі хутка прыйшлі ў катэдру. Мы загадалі разбіць сцяну, якая загароджвала ўваход і ўвайшлі ў крыпту - невялікае неатынкаванае скляпеністае гатычнае памяш-канне з чырвонай цэглы. Каралеўскія пахаванні былі ў жахлівым стане! Вада і тут зрабіла страшэнныя спусташэнні. Косці караля Аляксандра Ягелончыка і каралевы Лізаветы, першай жонкі караля Жыгімонта



*Чэрап вялікага князя і караля Аляксандра у кароне, верасень 1931 г.*

[2] Ваўжынец Гуцэвіч, (1753 - 1798) - архітэктар Рэчы Паспалітай, прадстаўнік класіцызму. У 1793-1794 і 1797-1798 гг. выкладаў у Галоўнай школе. З 1793 г. прафесар. Удзельнічаў у паўстанні 1794 г. пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі. Камандаваў арганізаванай ім жа грамадзянскай гвардыяй ў Вільні, быў паранены ў бітве пад Воранавым. - *Л. Л.*



*Часовы алтар пад балдахінам, усталяваны ў верасні 1931 г. над уваходам у крыпту каралеўскімі магіламі*

Аўгуста, бязладна ляжалі ў гразі, з гразі вынырваў каралеўскі чэрап з каронай, на сырой драўлянай бэльцы ляжаў паламаны і паедзены іржой меч. У параўнальна лепшым стане захаваліся толькі засыпаныя попелам і вапнай у труне парэштківа каралевы Барбары Радзівілоўны.

Рэакцыя вышэйшых уладаў у Варшаве была імгненнай. Ужо 22 верасня "Кур'ер Віленскі" паведамляў: *"21-м гарматным стрэлам адсалютавалі каралеўскім парэштькам"*. Урачыстае набажэнства 23 верасня ў віленскай катэдры ў 10 гадзін раніцы цэлебраваў арцыбіскуп



*Прафесар Міхал Райхер і Станіслаў Лорэнц у крыпце каля труны Барбары з Радзівілаў, з правага бока паліца з каронай каралевы Лізаветы*



*Карона каралевы Лізаветы на полцы ў крыпце, кастрычнік 1931 г.*

Ялбжыкоўскі. На набажэнстве прысутнічалі прадстаўнікі ўсіх уладаў. Падчас набажэнства зазванілі званы ўсіх віленскіх касцёлаў, адначасова спецыяльна размешчаныя батарэі далі 21 гарматны стрэл. *"... з раніцы войска заняло варту перад каралеўскім склепам. У першы дзень гонар несці тут службу атрымаў 19-ы полк палявой артылерыі"* - *"Прыпыненне руху транспарту на Кафедральнай плошчы"* - *"Пячаткі на крыпце: адтуліна, праз якую можна патрапіць у крыпту, замацавана жалезнымі кратамі з накладаннем пячаткаў* [...] *Сёння пячаткі будуць зняты толькі падчас наведвання крыпты маршалкам сенату панам Рачкевічам"*, які, даведаўшыся пра знаходку, адразу ж прыехаў у Вільню. Я асабіста атрымаў дзве пячаткі для апячатвання чырвоным сургучом: 1-ю з арлом і надпісам вакол яго: *"Польская Рэч Паспалітая Віленскае ваяводства"*, 2-я з гербам Віленскага кафедральнага капітула ў цэнтры і з надпісам вакол яго: *"Sigillum Capituli Cathedralis Vilnensis"*. Толькі я меў права здымаць пячаткі, і я адказваў за іх накладанне. Гэта працягвалася да таго часу, пакуль са склепа не вынеслі каралеўскія парэштківа, інсыгніі і каштоўнасці.

22 верасня пад кіраўніцтвам прафесара Рушчыца было афармлена тое месца ў галоўным нефе, дзе знаходзіўся ўваход у крыпту. Кіраўніцтва грамадскага камітэта звярнулася да ўсіх прадстаўнікоў улады і прэсы, каб пакланіцца каралеўскаму праху, прыйсці ў базыліку ў сераду 23 верасня.

Віленскае радыё адразу арганізавала перадачу пад назвай "Адкрыццё каралеўскіх магіл у Віленскай базыліцы". Перадачу вёў Вітольд Гулевіч, у ёй удзельнічалі біскуп Бандурскі, Рушчыц, Клос і я.

Прафесар Міхал Райхер з Універсітэта Стэфана Баторыя, анатам і антраполаг, і яго дацэнт, доктар Вітольд Сыльвановіч (пасля вайны прафесар Лодзінскага ўніверсітэта) былі запрошаны правесці даследаванні і падрыхтаваць каралеўскія парэштківа для пераносу ў імправізаваны маўзалей. Яны павінны былі супрацоўнічаць са мной.

Рушчыц, Сляндзінскі, Хопен і Квяткоўскі рабілі ў





крыпце малюнкі каралеўскіх парэшткаў, Булгак зрабіў некалькі фотаздымкаў, а я падрыхтаваў інвентарны вопіс. Хопен зрабіў павялічаныя ў два разы акварэльныя выявы пярсцёнкаў. Пазней Квяткоўскі напісаў вялікую карціну (сёння знаходзіцца ў музеі ў Ольштыне, падарунак кагосьці з віленцаў), на якой намалявана група з адзінаццаці чалавек у крыпце побач з труной Барбары Радзівілоўны. Пасярэдзіне Райхер і я, справа Рушчыц і біскуп Міхалкевіч, ніжэй Пекша, злева Сляндзінскі, Бранштэйн, Ліманоўскі, Сільвановіч, Хопен і рысаваль-шчык, якога я не пазнаю. Кампазіцыя, вядома, цалкам адвольная, такая група людзей у крыпце ніколі ўся разам не збіралася. Квяткоўскі прапусціў прафесара Клоса, якога трэба было намаляваць сярод іншых бо ён займаў важную пасаду ў камітэце, але мастак не любіў Клоса. Аднак Пекша быў намаляваны і гэта не выпадкова. Пекша і яго сябры распаўсюдзілі весткі, што менавіта ён знайшоў каралеўскія магілы. Гэта, вядома, няпраўда. Адкрыццё было зроблена ў ходзе даследаванняў, якія праводзіліся ўсім камітэтам і найбольшую заслугу маюць тыя, хто планаваў даследаванне, у першую чаргу Клос, а ў другую - я. Пекша на раніцы, калі Клоса яшчэ не было, прабіў дзюру ў цаглянай сцяне, што з'яўлялася недапушчальнай нелаяльнасцю[3]. Мы з Клосам павінны былі першымі ўбачыць карону Аляксандра Ягелончыка.

Мечыслаў Ліманоўскі ў кракаўскім "Ілюстраваным Кур'еры Штодзённым" ад 26 лістапада 1931 г. пісаў пра парэшткі Аляксандра Ягелончыка:

"*Перад намі косці караля Аляксандра ў гразі, у чорнай, вільготнай слізі, якая з'яўляецца вынікам гніення, гніення труны, цела, усіх тканін, у якія некалі было апранута цела. Кансерватар доктар Лорэнц і прафесар Райхер надзелі гумовыя пальчаткі, каб беспакарана капацца ў гразі і выбіраць з яе косці. Прывезлі драўляныя падносы, пакрытыя бляхай і вялікай колькасцю белага лігніну, які замяняе вату. Бачым, што чэрап караля можна падняць без усялякіх праблем. … Усе косткі ляжаць свабодна і іх таксама можна выняць.*

*У гэтым склепе бачым шакуючае, незвычайнае відовішча: у яркім святле дзвюх электрычных лямпаў чырвоныя рукі акунаюцца ў чорную слізь і ўважліва абмацваюць кожную яе часцінку, каб знайсці косці ці іншыя трывалыя прадметы. Праца мастакоў ідзе побач з пошукам. З чэрапа была знятая царская карона. Проста пад чэрапам два залатыя пярсцёнкі [...] Зноў глядзім на працу чырвоных рук у гумовых пальчатках. Прафесар Райхер і доктар Сільвановіч, як у моргу, апрануты ў белыя халаты, доктар Лорэнц у сваім шэрым кіцелі падобны на супрацоўніка пахавальнай канторы [...]*

*[Падчас пахавання] хто яшчэ быў ля труны, калі не Алена Іванаўна*[4]*, дачка маскоўскага цара Івана Васільевіча, якая ў гэтую жалобную гадзіну выканала свой апошні абавязак перад мужам і пакінула ў труне знакі, якія павінны былі прадухіліць нядобрае [. ..] Пасля адзінаццаці гадоў шлюбнага жыцця, сярод лацінскіх спеваў, яна не адмовілася ад паклонаў і забабонаў, якія прымусілі яе дадаць да сакральных рэчаў два аднолькавых кольцы-пярсцёнкі, усе каб спыніць злых духаў, якія маглі і далей перашкаджаць замагільнаму жыццю Аляксандра [...]*

*Праца падыходзіць да канца. Склеп злева ад труны Барбары ачышчаны. Стаяць бляшаныя вёдры, у якіх перанеслі гразь і чорную жыжу. Побач знаходзяцца драўляныя падносы, пакрытыя белым лігнінам, на якіх ляжаць рэшткі труны. Косткі складзеныя ў вялікай труне, якую неўзабаве вынесуць адсюль. Выходзім з падзямелля і бярэм труну, каб перанесці яе наверх, у памяшканне, якое даў капітул для далейшай працы. Незвычайна выглядае гэты перанос. Са свечкамі [...] падымаемся па лесвіцы [...] Нясуць труну [...] і гэта між волі стварае ўражанне нейкага дзіўнага пахавання..."*

На пачатку снежня прафесар Ліманоўскі пісаў у "Ілюстраваным Кур'еры Штодзённым" пра парэшткі каралевы Лізаветы ў віленскай крыпце: *"Пачынаем другі акт, выняўшы косткі караля Аляксандра, здабываем парэшткі Лізаветы, або Гальшкі, як называў сваю першую жонку Жыгімонт Аўгуст. За Барбарай у склепе ля сцяны стаяла труна, каля якой на сцяне мелася дошка разам з ланцугом і каронай [...] Чэрап каралевы ляжыць ля сцяны. Ён адкаціўся, валасы якія засталіся на чэрапе, маюць яшчэ светлы колер [...] Мы працягваем шукаць. Кансерватар доктар Лорэнц і прафесар Райхер, усё яшчэ шукаюць косці ля сцяны. Знаходзяць залаты медальён з выявай Жыгімонта Аўгуста. Медальён быў на шыі, знайшоўся і ланцужок ад яго. Ёсць і пярсцёнак. Брыльянты зіхацяць, пазначаючы абрысы лілеі. Вапняковыя камякі паказваюць, што цела ў труне было пакрыта вапнай".*

---

[3] Прэса паведамляла, што асобамі, якія першымі ўвайшлі ў пахавальную крыпту, сталі памочнік прафесара Клоса архітэктар Ян Пекша і тэхнік Казімір Вількус. Вількус потым успамінаў: *"Паразважаўшы, мы дамовіліся, што я зайду першым і асвятлю ўваход знутры. Я ўціснуўся першым і асвятліў уваход для Пекшы. Калідор сапраўды быў вельмі вузкі але я, ідучы папярэдзе, асвятляў падлогу, і гэтак мы патрапілі ў невялікі склеп памерам 3х4 м. Перад вачыма паўстаў дзіўны від. Перад уваходам, у гразі і друзе, у святле ліхтарыка я нешта ўбачыў. Спачатку падумаў, што гэта шлем, але гэта быў чалавечы чэрап з каронай. Я скіраваў святло ўправа - у куце крыпты, на камені, які тырчаў са сцяны, красавалася карона". - Л. Л.*

[4] Пра яе, гл: Марозава С.В. Вялікі князь літоўскі Аляксандр - Алена Маскоўская: дынастычны шлюб (1495 г.), які не прынёс Усходняй Еўропе міру // Мир для женщины - женщины для мира: материалы 5-й Междунар. науч.-практ. конф.. Гродно, 2016 . С.284-289.: Скарбы каралевы Алены (пераклад Леаніда Лаўрэша) // Наша слова.pdf № 49, 7 снежня 2022.

28 кастрычніка адбылося адкрыццё саркафага каралевы Барбары Радзівілоўны. Як паведамлялася ў віленскай прэсе, *"гэтую цяжкую і адказную працу ўзялі на сябе прафесар анатоміі Віленскага ўніверсітэта, доктар Міхал Райхер і кансерватар ваяводскай управы доктар Лорэнц [...] зняты блокі вапны каля галавы каралевы і адкрыўся дасканалы чэрап з каронай са звычайнага металу, пакрытыя той самай масай, якая пакрывала цела* [вапняковая маса]." *"У 7 гадзіну вечара, пасля таго як падднялі адзін з фрагментаў застылага вапнавага раствору, стаў часткова бачны невялікі скіпетр, малы яблычак інсыгніі і металічная таблічка, якая ляжала на грудзях".*



***Парэшткі каралевы Барбары з Радзівілаў - карона, скіпетр, на грудзях на залатым ланцугу таблічка з надпісам, кастрычнік 1931 г.***

Мы з вялікай цырымоніяй аднеслі інсыгніі на захаванне сакрыстыю. Першым пайшоў кс. прэлат Савіцкі, за ім на спецыяльным падносе інсыгніі нёс прафесар Рушчыц, побач з ім быў прафесар Райхер і я, астатняя частка працэсіі складалася з членаў гістарычна-мастацкай камісіі, і, зразумела, прафесар Клос ішоў разам з намі. Працэсія праходзіла ў цішыні, якую толькі парушыў Марэлоўскі, які падбег да Рушчыца і расчулена сказаў: "Фердынанд, Фердынанд, як я рады, што ты нясеш каралеўскія знакі".

Яшчэ ў крыпце я перапісаў тэксты з абедзвюх таблічак.

Тэкст з труны каралевы Лізаветы, вядомы з "Monumenta Sarmatorum" Старавольскага і "Вільні" Крашэўскага, вось ён:

CONDITUR HIC ELISABETH FERDI: RO: UNGA: ET BO
HE: REGIS FILIA. CAROLI: V: IMPERATORIS NEPTIS
SIGISMUNDI AUGUSTI REGIS POLONIAE ET MAGNI
DUCIS LITHWA: CHARA CONIUX PRAECLARA VIRTU
TE EGREGY, CUM ANIMI. TV CORPORIS DOTIBUS
ORNATA, PROLIS EXPERS. MORBO COMITIALI
OMNIU
INGENTI LUCTU ET MERORE VILNAE ANNO AETA
TIS SVE 18. REGNI SVI 3. ANNO VERO DOMINI
1545. DIE 15 MENSIS IUNY. MORITUR.

Невядомы тэкст таблічкі Барбары Радзівілаўны абвяшчае:

BARBARA QVE TEGITUR TUMULO: REGINA SUB ISTO
AUGUSTI CONIUNX ALTERA REGIS ERAT
COMMODA MULTA TULIT MULTIS: INCOMMODA
NULLI
A QVA SE LESUM: DICERE NEMO POTEST
IMMATURA OBYT DECIMA TRIETERIDE CEPTA
BIS VIDUOS FATIS LINQVERE IUSSA THOROS
OCCIDIT ANTE DIEM: AT QVAM VIS ANUS ILLA
FUISSET
DICERET AUGUSTUS: OCCIDIT ANTE DIEM
CORONATA. 7. DECEMBRIS ANNI. 1550 OBIIT. 8 MAEII.
1551

У наступныя месяцы і гады ўся Вільня была заклапочана выратаваннем катэдры і пытаннем захавання каралеўскіх магіл.

У суботу 16 студзеня 1932 г. па ініцыятыве Таварыства мастакоў у Малой Ратушы адбылася мая лекцыя пра каралеўскія магілы, якая скончылася заклікам збіраць ахвяраванні для Камітэта выратавання Віленскай базылікі, бо далейшая праца будзе патрабаваць вялікіх выдаткаў. На лекцыі прысутнічалі арцыбіскуп Ялбжыкоўскі і біскуп Міхалкевіч. А ў пачатку 1933 г. я падрыхтаваў дзесяцістаронкавую брашуру пад назвай "Выратуем віленскую базыліку", яе выдаў Камітэт.

Я інфармаваў, што пад капліцай св. Казіміра, дзе кароль Жыгімонт III меў намер паставіць каралеўскія труны, ужо пачалося будаўніцтва маўзалея. Што тычыцца плана кансервацыйных работ, дык стала зразумела, што найбольш пільнай справай ёсць забеспячэнне пярэдняга порціка, бакавых каланад, сцен і ўнутраных слупоў. Пасля завяршэння даследаванняў, 1 чэрвеня 1932 г., Камітэт даручыў распрацаваць дэталёвы праект кансервацыі і прызначыў кіраваць працамі інжынера Генрыка Вансовіча з Варшавы, які прыцягнуў да супрацоўніцтва Пекшу і інжынера Юрэвіча. У пачатку верасня 1932 г. для забеспячэння бяспекі падчас работ вакол порціка пачалі будаваць драўляныя рыштаванні. Праект умацавання порціка заключаўся ў тым, каб абаперці яго на паўсотні жалезабетонных паль, заглыбленых на дзевяць ці дзесяць метраў у зямлю. Работы на падмурку порціка былі завершаны 15 лютага 1933 г. Паколькі порцік з-за апускання падмуркаў нахіляўся ў бок Саборнай плошчы, вышэй скляпенняў порціка было закладзена адзінаццаць жалезных сцяжак.

У канцы сваёй брашуры я паведаміў, што праца будзе доўжыцца некалькі гадоў і будзе каштаваць яшчэ восемсот тысяч злотых. Віленскае грамадства аказвала шчодрую матэрыяльную дапамогу, але самастойна справіцца не магло. Таму мы звярнуліся з самым настойлівым заклікам да ўсяго грамадства ратаваць віленскую базыліку.

***Пераклад і каментары Леаніда Лаўрэша.***

*(Заканчэнне ў наступным нумары.)*

*Станіслаў Лорэнц*

# Віленскі альбом

***(Разліў Віліі і знаходка каралеўскіх магіл - Пошукі магілы Вітаўта - Справа з помнікам Міцкевічу)***

*(Заканчэнне. Пачатак у папярэднім нумары.)*

Першы этап работ, звязаных з адкрыццём каралеўскіх магіл, скончыўся ў чацвер 31 жніўня 1933 г. У саборы адбылася цырымонія перанясення парэштkаў караля Аляксандра Ягелончыка, каралевы Лізаветы, Барбары Радзівілоўны і караля Уладзіслава IV у імправізаваны маўзалей, размешчаны ў капліцы Беззаганнага Зачацця Найсвяцейшай Панны Марыі - былой каралеўскай капліцы.

"Кур'ер Віленскі" 1 верасня 1933 года паведамляў: *"Тры труны былі пастаўленыя побач адна каля адной на ўзвышшы, збоку знаходзілася урна з парэшткамі караля Уладзіслава IV. Да трунаў, зробленых з цёмнага дубу, прыбіты серабрыстыя таблічкі: Аляксандр... Альжбета... Барбара [...], надпіс на урне: "Cor et viscera Vladislai IV" [...] Каралеўскія косці, пакрытыя белым празрыстым шоўкам, бачныя нібы праз імглу [...] Кансерватары парэштkаў, прафесар Райхер, доктар Сільвановіч і доктар Лорэнц накрылі косці фіялетавымі саванамі і зачынілі труны і урну. Перавязаўшы труны і урну бела-чырвонымі стужкамі, кансерватар Лорэнц запячатаў іх дзяржаўнай пячаткай, а пробашч базылікі, кс.-канонік Ціхонскі пячаткай Віленскай мітрапалічай капітулы.*

*Потым перанеслі труны, урну і копіі каралеўскіх інсыгній у былую каралеўскую капліцу [цяпер імправізаваны маўзалей], упрыгожаную паводле праекту мастака Ежы Хопена [...] Капліца ўпрыгожана пышнымі саборнымі габеленамі, па кутах вісяць харугвы з гербамі манархаў, а ўверсе, пад купалам, - тарчы з дзяржаўнымі гербамі. Пасярэдзіне на трохступеньчатай аснове стаяць высокія катафалкі: сярэдні, самы высокі з іх [...] Аляксандра, справа каралева Лізавета, злева - Барбара Радзівілоўна. Катафалкі і прыступкі пакрытыя пурпуровым сукном з багата вышытымі гербамі.*

*Пад касцельныя спевы труны паставілі на катафалкі і накрылі чырвоным штандарам з белым арлом. Копіі інсыгній паклалі на чырвоныя падушкі, аздобленыя залатым шнурам і размясцілі на трунах. Урна з парэшткамі Уладзіслава IV была ўстаноўлена перад катафалкам Аляксандра Ягелончыка".*

Труны зроблены паводле праекту архітэктара Стэфана Нарэмбскага, урна - Ежы Хопена.

У сакрыстыі катэдры, у шкляных вітрынах былі выстаўлены кароны, інсыгніі і каралеўскія пярсцёнкі. Тут



***Ежы Хопен - праект часовага каралеўскага маўзалея ў адной з капліц віленскай катэдры.***

таксама экспануюцца карціны, напісаныя ў крыпце Рушчыцам, Сляндзінскім, Хопенам і Квяткоўскім, а таксама фотаздымкі Булгака.

Кансервацыя базылікі і будаўніцтва пад капліцай св. Казіміра каралеўскага маўзалея было закончана пасля таго, як я ўжо пакінуў Вільню. Гэты маўзалей мы наведалі з Ірэнай падчас побыту ў Вільні ў 1973 г.

Знаходка каралеўскіх магіл на працягу некалькіх гадоў натхняла Вільню і напачатку шырока адазвалася па ўсёй Польшчы. Рэмер, як генеральны кансерватар, аб'ездзіў з лекцыямі многія гарады, пры гэтым ён ілюстраваў сваю лекцыю слайдамі, зробленымі паводле фотаздымкаў Булгака. Пазней ён расказваў, што на ганарары купіў жонцы цудоўнае футра. Маралоўскі шырока рэкламаваў свой удзел у адкрыцці магіл. Іх актыўнасць была нават крыху празмернай. Хопен намаляваў пра гэта карыкатуру, якую перадаў мне: у склепе, на зямлі пад гатычнай аркадай, у цэнтры знаходзіцца каранаваны чэрап, над якім з абодвух бакоў схіліліся Рэмер і Маралоўскі.

Гістарычна-мастацкая камісія - з дзясятак чалавек,





збіралася ў вялікай гасцёўні кватэры ксяндза-прэлата Савіцкага. На адной з сустрэч адбыўся смешны выпадак. Прафесар Маралоўскі з'явіўся вельмі позна - спазніўся на паўгадзіны ці нават болей. З дзвярэй ён пачаў горача выбачацца перад кс. Савіцкім за спазненне - раптам захварэла яго жонка, і ён вельмі рэалістычна апісваў нам сімптомы яе хваробы... Яму давялося неадкладна выклікаць лекара. Пасля тлумачэнняў Маралоўскі сеў побач са мной. Я ціха павярнуўся да яго і сказаў, што неадкладна патэлефаную сваёй жонцы і папрашу, каб яна дагледзела хворую. Маралоўскі адмовіўся. Я папрасіў яго не саромецца, бо ўсяроўна патэлефаную. Тады ён ціха сказаў мне: "Не тэлефануй, жонка здаровая, але я праспаў і спазніўся, таму трэба было гэта неяк растлумачыць".

* * *

Пасля адкрыцця каралеўскіх магіл чакалася, што знойдзецца і магіла Вітаўта. Гэта вельмі зацікавіла летувісаў, "краёўцаў" і ўвогуле ўсё віленскае грамадства. Пачалі распаўсюджвацца чуткі, што з палітычных меркаванняў мы хаваем адкрыццё магілы ці, што мы наогул не жадаем знайсці магілу вялікага князя. У 1933 г. чуткі разышліся так шырока, што трэба было дасканала высветліць справу. У нядзельным нумары "Кур'ера Віленскага" ад 16 ліпеня 1933 г. я апублікаваў вялікі артыкул пра лёс парэшткаў вялікага князя Вітаўта, у якім канстатаваў, што даследаванне падполля сабора скончана і слядоў ні магілы, ні труны, ні парэшткаў Вітаўта не знойдзена. Я патлумачыў, што, напэўна здарылася: мусіць, магіла была пашкоджана падчас маскоўскага нашэсця ў 1655 г. Вядома, што тады маскоўскія войскі паламалі ўсе надмагільныя пліты ў катэдры не толькі з самалюбства, але і ў пошуках кляйнотаў і каштоўнасцяў. Магіла Вітаўта з надмагіллем адназначна зламаныя; калі і былі ў ім інсыгніі і каштоўныя рэчы, дык яны разрабаваны, а даглядаць косці ў той час не было каму, бо ў Вільні не было членаў капітула, а гараджанам хапала сваіх спраў. Магчыма, зараз у саборы і знаходзяцца косці вялікага князя, але яны ляжаць сярод многіх тысяч безыменных костак, што валяюцца ў друзе пад падлогай[5].

Праз год абмеркаванне справы нечакана аднавілася. У часопісе "Пакс" у лістападзе 1934 г. кс. Валерыян Мяйштовіч апублікаваў артыкул: "Дзе магіла Вітаўта?". Гэта той кс. Мяйштовіч, які пасля вайны разам з Карлам Ланцкаронскім у Рыме апублікаваў архіўныя матэрыялы Ватыканскага архіва, якія тычацца Польшчы. 30 лістапада 1934 г. Камітэт выратавання базылікі абвясціў заяву аб тым, што згадкі ксяндза Мяйштовіча ўводзяць у зман, не адпавядаюць рэчаіснасці і грунтуюцца на недастатковым веданні гісторыі віленскай катэдры.

Падчас майго знаходжання ў Вільні, апошняй працай у віленскай базыліцы была кансервацыя капліцы св. Казіміра. У артыкуле пра капліцу ў "Кур'еры Віленскім" ад 20 красавіка 1935 г., я пісаў што кансервацыя гэтай капліцы мае выключнае значэнне з-за яе мастацкай і гістарычнай каштоўнасці. Я абвясціў, што абмяркую праблему яе кансервацыі ў асобным артыкуле, а пакуль што толькі хачу выкласці вынікі найноўшых даследаванняў архітэктуры і скульптурна-жывапіснага аздаблення капліцы, будаўніцтва якой распачаў яшчэ кароль Жыгімонт III і завяршыў Уладзіслаў IV у 1636 г. Пасля разбурэння падчас маскоўскага нашэсця, аднаўленне капліцы пачалося толькі ў 1668 г. і праца над ёй працягвалася да 1692 г. Цяпер, калі ў капліцы былі пастаўлены рыштаванні і пачаліся работы пад кіраўніцтвам прафесара Яна Рутkoўскага з Варшавы, які быў асабіста адказны за захаванне цудоўных насценных роспісаў і скляпенняў, можна было ўважліва агледзець ляпніну на скляпеннях і роспісы купальных ветразяў. Мяне гэта вельмі захапіла, бо я пачаў падазраваць, што аўтарам карцін быў Мікеланджэла Палоні, выдатны мастак, які працаваў у Вілянаўскім палацы, у Місіянерскай капліцы ў Ловічах і ў касцёле св. Пятра і Паўла на Антокалі ў Вільні.

У першай палове чэрвеня 1935 г., калі я аднойчы сядзеў у капліцы на рыштаваннях, мне пачалі крычаць, каб я спусціўся, бо па тэрміновай справе прыехала мая жонка. Ірэна стаяла ўнізе з лістом у руцэ. Гэта быў ліст за подпісам віцэ-прэзідэнта Варшавы Яна Пахоскага з прапановай прызначыць мяне кіраўніком Нацыянальнага музея ў Варшаве.

* * *

Адной з найважнейшых падзей падчас майго знаходжання ў Вільні была справа ўстаноўкі помніка Адаму Міцкевічу. Пра гэта апавядаецца ў кнізе Яроцкага, таму я зараз толькі дапоўню раней сказанае.

Старшынём Камітэта па будаўніцтву помніка Адаму Міцкевічу ў Вільні быў генерал Люцыян Жалігоўскі. Паколькі пасля прыезду ў Вільню я быў каптаваны ў прэзідыум Камітэта і заняў там пасаду сакратара, я сустракаўся з генералам кожны раз, калі ён прыязджаў у Вільню са свайго не вельмі вялікага маёнтка ў мястэчку Андрэева. "Ідэяй фікс" генерала ў той час было вырошчванне і выкарыстанне ільну, асабліва ён прапагандаваў нашэнне ільнянога адзення. Што праўда, у Вільню заўсёды прыязджаў у мундзіры. Вялікім ідэйным прапагандыстам мужчынскага ільнянога адзення з'яўляўся і Януш Ягмін, прафесар сельскай гаспадаркі і раслін Віленскага ўніверсітэта. І генерал, і Ягмін надта хацелі спакусіць мяне апрануць ільняное адзенне, але гэта ім не ўдалося. Такая вопратка выглядала непрывабна нават на Ягміну, які добра яе даглядаў, яна лёгка мялася і хутка пэцкалася. Жалігоўскі ставіўся да мяне (яму было 66 гадоў) не толькі як да сакратара Міцкевічаўскага камітэта,

[1] Гл: Артыкулы пра пошукі магілы Вітаўта (пераклад Леаніда Лаўрэша) // Наша слова.pdf № 50, 14 снежня 2022. - *Л. Л.*



***Праект помніка Міцкевічу ў Вільні скульптара Генрыка Куна***

але і як да маладога чалавека, які павінен дапамагаць яму ў агульных справах, асабліва ў галіне культуры.

Ён меў да мяне вялікую сімпатыю. Маю наступны ліст ад яго, датаваны 28 кастрычніка 1931 г. у Андрэеве: *"Шаноўны спадар. Адна спадарыня даслала свае песні і хоча, каб Камітэт апублікаваў [!] іх. Я вельмі прашу вас разгледзець гэтае пытанне і адказаць гэтай жанчыне. Я думаю, што Камітэт не можа займацца гэтым пытаннем і не можа траціць на гэта грошы. Калі вы гэтак жа лічыце, калі ласка, вярніце песні гэтай даме. Шлю прывітанне, Л. Жалігоўскі".*

Жалігоўскі не меў свайго погляду на справу помніка, ён верыў Рушчыцу і мне, а таксама раіўся з Бэчкавічам.

Фердынанд Рушчыц быў вельмі чынным у Камітэце. Ён узначаліў мастацкую камісію, і мы разам з ім арганізавалі выставу праектаў помнікаў у Рэпрэзентатыўным палацы, ці так званай Рэчы Паспалітай. Выстава адкрылася 7 лютага 1932 г. Рушчыц быў прыхільнікам праекта Куна, які лічыў вельмі добрым, несумненна лепшым з прадстаўленых на конкурсе. Пасля таго, як 18 сакавіка 1932 г. на агульным сходзе Камітэта па будаўніцтве помніка праект Куна абралі для рэалізацыі, з ім было падпісана пагадненне. Помнік павінен быў быць гатовы ў красавіку 1935 г. і ўсталяваны ў красавіку-траўні. Урачыстае адкрыццё помніка планавалася на чэрвень таго ж года. Кантроль за ходам працы ўсклалі на выканаўчую камісію Камітэта ў складзе: прафесара Рушчыца, дырэктара Юзафа Каральца (скарбнік) і мяне (сакратар). Штаб-кватэра Камітэта знаходзілася ў банку, дырэктарам якога быў Каралец, па вул. Міцкевіча 24, пакой 3. Рушчыц з вялікай адданасцю і эмацыянальнай заангажаванасцю паставіўся да справы помніка. Пры неабходнасці, ён ездзіў уначы ў Варшаву і ўначы ж вяртаўся ў Вільню, дзве ночы ў цягніку і цэлы дзень вельмі актыўнага знаходжання ў Варшаве яго знясільвалі, хоць і меў ён ўсяго 62 гады. На жаль, гэта скончылася дрэнна, бо ў кастрычніку 1932 г. Рушчыц цяжка захварэў. У сераду, 26 кастрычніка, ён даслаў мне ліст, яшчэ напісаны правай рукой: *"Шаноўны пан Станіслаў! Я ляжу і мне не даюць падняцца. Спроба ўстаць двойчы мела дрэнны вынік. Дактары хочуць пасадзіць мяне на 10 сутак у шпіталь на аналізы і там здзекавацца. У сувязі з такой прымусовай дэпартацыяй, прашу без майго ўдзелу вырашаць бягучыя справы: справу з гранітам* [для пастамента помніка] *разам са спадаром Каральцом … Мне вельмі шкада вас*



***Эскіз устаноўкі помніка на плошчы Ажэшкі***

*расчараваць, але сёння я ў няволі ў лекараў. Спадзяюся, калі-небудзь аднавіць свае правы. Ф. Рушчыц перадае гарачае прывітанне".*

Але адбылося не паляпшэнне, а пагаршэнне стану здароўя Рушчыца, і 28 кастрычніка ён адмовіўся ад творчай, універсітэцкай і грамадскай дзейнасці. Пазней мастак назаўсёды пераехаў у Багданава, але ўсяроўна дасылаў мне лісты напісаныя левай рукой.

Грамадскасць вітала рашэнне Камітэта. Праекты помнікаў былі ўсім добра вядомыя, бо іх бачылі на адмысловай выставе 7 лютага, гэта значыць за пяць тыдняў да пасяджэння Камітэта. На пасяджэнні праект Куна быў ухвалены 85 галасамі супраць 5. Так што не толькі журы - у асобе прафесара Адольфа Шышка-Богуша, прафесара Тадэвуша Брэера, прафесара Клоса, прафесара Марыяна Лялевіча, прафесара Уладзіслава Скачыласа, прафесара Слядзінскага і прафесара Яна Шчапкоўскага, а таксама старшыні мастацкай камісіі Камітэта Фэрдынанда Рушчыца, выказаліся за праект Куна, але за яго былі і прадстаўнікі віленскага грамадства. Праз два гады, у красавіку 1934 г., калі цокаль з дванаццаці пліт з разьбой (сцэны з Дзядоў) быў амаль завершаны, неабгрунтаваны замах на помнік Куна распачаў "Слове" Цат-Мацкевіч. Ён адкрыў апытанку "Ці падабаецца вам помнік Куна ў Вільні?" Я адказаў на гэта вельмі рэзкім артыкулам у "Кур'еры Віленскім" ад 24 красавіка 1934 г., які заканчваўся словамі Рушчыца: *"Праф. Фердынанд Рушчыц цалкам падтрымлівае праект Куна і перасцерагае ад пераносу мастацкай і прафесійнай дыскусіі на шырэйшую грамадскую пляцоўку, бо выбар помніка вялікаму паэту - гэта не выбары Міс Палёніі".* Ежы Вышамірскі ў "Слове" вельмі рэзка выказаўся ў адказе на апытанку і нагадаў, што Кунам апекавалася Ажэшка, што ён стварыў сапраўдны твор мастацтва і што абраў ідэальнае месца для помніка. *"Чэрвеньскай ноччу 1932 г. я сядзеў з Кунам,* - пісаў Вышамірскі, - *у скверы Ажэшкі. Глядзеў на месца, дзе будзе стаяць яго помнік. Уяўляў гэты пляц у будучыні і бачыў яго такім, якім яго можа бачыць толькі сам мастак".*

Гэты дрэнны ўчынак Мацкевіча, які ўвесь час ганяўся за сенсацыяй, быў вельмі непрыгожым, а для мяне вельмі паскудным быў і сам Мацкевіч.



**Сучасны помнік Адаму Міцкевічу ў Вільні**

***Ад перакладчыка****: Помнік Адаму Міцкевічу ў Вільні быў усталяваны толькі ў 1984 г. непадалёк ад званіцы касцёла Святой Ганны і бернардынскага касцёла Святога Францішка ў паўднёвай частцы сквера на беразе Віліі. Аўтар помніка - скульптар Гедымінас Ёкубоніс і архітэктар Вітаўтас Чаканаўскас.*

***Пераклад і каментары Леаніда Лаўрэша.***